2. Навукова-праектная дакументацыя на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, рэалізацыя якой можа прывесці да істотнага змянення матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорый "0", "1", "2" ці да іх знішчэння, страты ці знікнення або да змянення ўмоў утрымання і выкарыстання эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, папярэдне разглядаецца на пасяджэнні Навукова-метадычнай рады. Навукова-праектная дакументацыя на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, якая не адобрана Навукова-метадычнай радай, узгадненню не падлягае.

Неабходнасць разгляду Навукова-метадычнай радай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, не ўказанай у частцы першай гэтага пункта, вызначаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

Выдаткі, звязаныя з разглядам Навукова-метадычнай радай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, кампенсуюцца заказчыкам навукова-праектнай дакументацыі.

3. Юрыдычныя і фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, якія з'яўляюцца заказчыкамі навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, у абавязковым парадку павінны перадаваць бязвыплатна ў Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь устаноўленыя Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь раздзелы гэтай навукова-праектнай дакументацыі, якія датычацца выканання рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях і работ у зонах аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

4. У працэсе падрыхтоўкі навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, а таксама пры яе ўзгадненні прызнаецца прыярытэт аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

5. Узгадненне з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях не вызваляе ад неабходнасці яе ўзгаднення з іншымі дзяржаўнымі органамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## Глава 8
## УТРЫМАННЕ І ВЫКАРЫСТАННЕ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

Артыкул 44. Ахоўныя абавязацельствы

1. Для кожнай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці або кожнага эталона фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь вызначаюцца індывідуальныя ўмовы іх утрымання і выкарыстання, устанаўліваюцца парадак выканання работ на гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцях, іншыя абмежаванні дзейнасці іх уласнікаў (уладальнікаў) і (або) карыстальнікаў, а таксама патрабаванні па забеспячэнню іх захавання, у тым ліку ў выпадках надзвычайных сітуацый ці ў перыяд узброеных канфліктаў. Гэтыя патрабаванні фіксуюцца ў ахоўным абавязацельстве, складзеным па форме, устаноўленай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, і падлягаюць выкананню ўсімі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

2. Ахоўнае абавязацельства падпісваецца ўласнікам або па яго даручэнню ўладальнікам гісторыка-культурнай каштоўнасці ў тэрмін, прадугледжаны пунктамі 2 і 3 артыкула 53 гэтага Закона.

Артыкул 45. Асаблівасці выкарыстання матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

1. Выкарыстанне матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (навакольнага асяроддзя нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і зон іх аховы) і эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей павінна ажыццяўляцца ў адпаведнасці з іх гісторыка-культурнай значнасцю, а таксама згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, індывідуальнымі ўмовамі іх утрымання і выкарыстання, вызначанымі Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, з улікам неабходнасці забеспячэння захавання гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей.

2. Выкарыстанне матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (навакольнага асяроддзя нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і зон іх аховы) і эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у мэтах, звязаных з дзейнасцю Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і іншых воінскіх фарміраванняў, якія ствараюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у мірны і ваенны час, а таксама знаходжанне матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей на тэрыторыі, занятай такімі воінскімі фарміраваннямі, забараняюцца.

3. Выкарыстанне матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (навакольнага асяроддзя нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і зон іх аховы) і эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту, калі гэта стварае пагрозу захаванню гэтых каштоўнасцей (навакольнаму асяроддзю нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і зонам іх аховы), а таксама ўчыненне якога-небудзь іншага акта, накіраванага супраць гэтых каштоўнасцей (навакольнага асяроддзя

Репозиторий ВГУ

нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і зон іх аховы), забараняюцца, за выключэннем неабходнасці вырашэння выключных дзяржаўных задач у ваенны час.

Артыкул 46. Неадпаведнае выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей

1. Неадпаведнае выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей (не ў адпаведнасці з іх гісторыка-культурнай значнасцю) вядзе да спагнання з іх карыстальнікаў у парадку, прадугледжаным артыкулам 48 гэтага Закона, кампенсацыі за шкоду, што прычыняецца гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам іх аховы неадпаведным іх выкарыстаннем, і за абмежаванне ў сувязі з гэтым доступу грамадзян да гісторыка-культурных каштоўнасцей.

2. Выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей па іх першапачатковаму прызначэнню не лічыцца неадпаведным выкарыстаннем.

Артыкул 47. Прадпрымальніцкая дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурную каштоўнасць або зоны аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці

1. Прадпрымальніцкая дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурную каштоўнасць або зоны аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці шляхам стварэння дадатковых транспартных нагрузак, прыўнясення функцый, не характэрных для гэтай каштоўнасці, стварэння дадатковых аб'ёмна-прасторавых збудаванняў, не ўласцівых і не характэрных для гэтай гісторыка-культурнай каштоўнасці, не можа ажыццяўляцца без пагаднення, заключанага ў пісьмовай форме з уласнікам гісторыка-культурнай каштоўнасці, і дазволу, атрыманага ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 33 гэтага Закона.

2. Юрыдычныя і фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць у адпаведнасці з пагадненнем, прадугледжаным пунктам 1 гэтага артыкула, абавязаны штогод у парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, рабіць адлічэнні ў фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Памеры такіх адлічэнняў складаюць для юрыдычных і фізічных асоб Рэспублікі Беларусь, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, 5 працэнтаў, для замежных юрыдычных і фізічных асоб - 25 працэнтаў ад прыбытку, атрыманага ў выніку дзейнасці, якая аказала непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурную каштоўнасць або зоны аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 07.05.2007 N 212-З)

Артыкул 48. Парадак выплаты кампенсацыі за шкоду, што прычыняецца гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

1. У выпадку, калі юрыдычныя і (або) фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, не маюць магчымасці абмежаваць або поўнасцю спыніць дзейнасць, прадугледжаную пунктамі 3 і 5 артыкула 32 і (або) абмежаваную артыкулам 44 гэтага Закона, або дапускаюць неадпаведнае выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей, прадугледжанае артыкулам 46 гэтага Закона, яны павінны выплачваць у фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва кампенсацыю за шкоду, прычыненую гэтым гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, і за абмежаванне ў сувязі з гэтым доступу грамадзян да гісторыка-культурных каштоўнасцей. Кампенсацыя выплачваецца ў памеры да 5 працэнтаў ад прыбытку, атрыманага ў выніку дзейнасці, якая прычыніла шкоду гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Калі юрыдычныя і (або) фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, не ажыццяўляюць прадпрымальніцкай дзейнасці, звязанай з атрыманнем прыбытку, яны павінны штомесяц выплачваць фіксаваную суму кампенсацыі ў фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 07.05.2007 N 212-З)

2. Працэнт адлічэнняў ці фіксаваная сума кампенсацыі за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, і парадак іх выплаты ўстанаўліваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 07.05.2007 N 212-З)

## Глава 9
## ПРАВА ЎЛАСНАСЦІ НА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Артыкул 49. Прававое рэгуляванне пытанняў уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці

1. Падставы ўзнікнення і парадак ажыццяўлення права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці, вызначэнне права ўласнасці на матэрыяльныя аб'екты або нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека, якія могуць уяўляць гісторыка-культурную каштоўнасць і на момант іх выяўлення або надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці не маюць уласніка, а таксама парадак выкупу гісторыка-культурных каштоўнасцей, што ўтрымліваюцца безгаспадарна, вызначаюцца гэтым Законам і грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Пры наданні матэрыяльным аб'ектам і нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці права ўласнасці на іх захоўваецца.

Рэпазіторый ВГУ

Артыкул 50. Суб'екты права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці

1. Гісторыка-культурныя каштоўнасці могуць знаходзіцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь, юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў.

2. Асобныя гісторыка-культурныя каштоўнасці могуць быць аднесены законам да аб'ектаў, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 51. Правы ўласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці або эталона фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Правы ўласніка калекцыі

1. Уласнік матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці або эталона фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці апрача іншых правоў, якія ў адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь належаць яму як уласніку, мае правы:

1.1. перадаваць гісторыка-культурную каштоўнасць на захоўванне дзяржаўным органам і ўстановам з вызначэннем умоў яе ўтрымання і выкарыстання;

1.2. карыстацца пераважным правам набыцця іншых састаўных частак гісторыка-культурнай каштоўнасці, якія знаходзяцца ў агульнай уласнасці;

1.3. на матэрыяльную дапамогу за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, для выканання работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці ў межах ахоўнага абавязацельства пры адсутнасці ўласных сродкаў.

2. Уласнік калекцыі (яе часткі) мае права на бязвыплатнае атрыманне ад дзяржаўных музеяў, бібліятэк і (або) архіваў, іншых дзяржаўных арганізацый наступных паслуг:

2.1. вызначэнне індывідуальных умоў утрымання і выкарыстання калекцыі ў цэлым і (або) яе асобных прадметаў;

2.2. дапамога ў правядзенні навуковай інвентарызацыі і навуковай апрацоўкі прадметаў калекцыі;

2.3. захаванне ў дзяржаўных установах адпаведнага профілю прадметаў калекцыі. Пры гэтым дзяржаўная ўстанова мае права на выкарыстанне для мэт навукі і экспанавання прадметаў калекцыі (яе часткі або асобнага прадмета), перададзеных ёй на захоўванне;

2.4. гарантыя бяспекі калекцыі і (або) яе асобных прадметаў у час экспанавання і (або) перавозкі.

3. Па жаданню ўласніка калекцыі (яе часткі або асобнага прадмета) Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама дзяржаўныя музеі, бібліятэкі і (або) архівы, іншыя дзяржаўныя арганізацыі, прыцягнутыя да аказання паслуг, прадугледжаных пунктам 2 гэтага артыкула, абавязаны гарантаваць канфідэнцыяльнасць звестак аб уласніку калекцыі (яе часткі або асобнага прадмета).

Артыкул 52. Абмежаванне правоў уласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці або эталона фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці

Уласніку матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці або эталона фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці забараняецца:

знішчаць гісторыка-культурную каштоўнасць;

дапускаць прычыненне шкоды, змяненне гісторыка-культурнай каштоўнасці і выкананне работ на гэтай гісторыка-культурнай каштоўнасці без дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, за выключэннем работ, прадугледжаных артыкулам 38 гэтага Закона;

адчужаць або іншым чынам перадаваць права ўласнасці на гісторыка-культурную каштоўнасць без узгаднення з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь;

мяняць месца знаходжання (захоўвання), умовы ўтрымання і выкарыстання гісторыка-культурнай каштоўнасці без узгаднення з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь;

вывозіць гісторыка-культурную каштоўнасць за межы Рэспублікі Беларусь на пастаяннае захоўванне;

перадаваць гісторыка-культурную каштоўнасць у валоданне і (або) карыстанне Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь, іншым воінскім фарміраванням.

Артыкул 53. Абавязкі ўласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці або эталона фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці

1. Уласнік матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці або эталона фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці абавязаны ўзяць на сябе абавязкі па забеспячэнню іх захавання шляхам падпісання ахоўных абавязацельстваў, складзеных па форме, устаноўленай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, у тым ліку:

1.1. забяспечваць захаванасць гісторыка-культурнай каштоўнасці;

1.2. забяспечваць доступ да гісторыка-культурнай каштоўнасці спецыялістам, якія з дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь маюць права на яе вывучэнне;

1.3. прадастаўляць перыядычна або па дамоўленасці з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь ці адпаведнымі ўстановамі культуры доступ да гісторыка-культурнай каштоўнасці грамадзянам на тэрмін не менш чым шэсць месяцаў на працягу кожных дзесяці гадоў;

Репозиторий ВГУ

1.4. паведамляць у Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб акалічнасцях, якія пагражаюць захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці;

1.5. захоўваць у цэласнасці калекцыі і іншыя навукова абгрунтаваныя зборы рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей або эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

2. Пры набыцці права ўласнасці на матэрыяльную гісторыка-культурную каштоўнасць або эталон фіксаванай нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці новы ўласнік або па яго даручэнню ўладальнік абавязаны на працягу аднаго месяца падпісаць ахоўнае абавязацельства. Невыкананне гэтай умовы цягне за сабой прызнанне такой здзелкі нічога не вартай.

3. У выпадку надання матэрыяльнаму аб'екту статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ўласнік гэтага аб'екта або па яго даручэнню ўладальнік абавязаны на працягу аднаго месяца падпісаць ахоўнае абавязацельства. Невыкананне гэтай умовы можа прывесці да прызнання названага аб'екта ва ўстаноўленым парадку гісторыка-культурнай каштоўнасцю, якая ўтрымліваецца безгаспадарна.

Артыкул 54. Правы фізічных асоб, якія маюць непасрэдныя адносіны да ўзнікнення (стварэння) гісторыка-культурнай каштоўнасці

Калі матэрыяльны аб'ект або нематэрыяльнае праяўленне творчасці чалавека, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, па свайму паходжанню ці зместу звязаны з пэўнай фізічнай асобай або яе непасрэднымі продкамі (на працягу не больш чым двух пакаленняў), гэта фізічная асоба мае права абумовіць недаступнасць гісторыка-культурнай каштоўнасці для публічнага агляду (іншага спосабу раскрыцця зместу гісторыка-культурнай каштоўнасці) пры яе жыцці або на іншы тэрмін, які не перавышае гэтага часу.

Артыкул 55. Пераважнае права набыцця гісторыка-культурнай каштоўнасці (яе састаўной часткі)

Пры продажы долі ў агульнай уласнасці на гісторыка-культурную каштоўнасць астатнія ўдзельнікі долевай уласнасці маюць пераважнае права набыцця гэтай долі па цане, за якую яна прадаецца. У выпадку іх адмовы або немагчымасці набыць састаўную частку гісторыка-культурнай каштоўнасці пры яе продажы пераважнае права яе набыцця мае дзяржава.

## Глава 10
## ФІНАНСАВАННЕ АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Артыкул 56. Фінансаванне аховы гісторыка-культурнай спадчыны

Фінансаванне аховы гісторыка-культурнай спадчыны ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, уласнікаў і (або) уладальнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 57. Фінансаванне некаторых мерапрыемстваў па прадухіленню пагрозы захаванню нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей або зонам іх аховы

За кошт юрыдычных і (або) фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, зацікаўленых у праектаванні і выкананні земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых відаў работ, якія могуць стварыць пагрозу захаванню нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей або зонам іх аховы, ажыццяўляюцца мерапрыемствы, прадугледжаныя часткай першай пункта 7 артыкула 32 гэтага Закона.

Артыкул 58. Фінансаванне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях у межах ахоўных абавязацельстваў

Фінансаванне работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях у межах ахоўных абавязацельстваў ажыццяўляецца за кошт сродкаў уласнікаў і (або) уладальнікаў гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў выпадку, прадугледжаным падпунктам 1.3 пункта 1 артыкула 51 гэтага Закона, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## Глава 11
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

---

Статья 59 вступила в силу со дня официального опубликования.

---

Артыкул 59. Уступленне ў сілу гэтага Закона

Гэты Закон уступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 60, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

---

Статья 60 вступила в силу со дня официального опубликования (статья 59 данного документа).

Репозиторий ВГУ

Артыкул 60. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона:
прыняць меры па прывядзенню актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам;
прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

Артыкул 61. Прызнанне некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь страціўшымі сілу

У сувязі з прыняццем гэтага Закона прызнаць страціўшымі сілу:
Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 1992 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 30, арт. 504);
Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 сакавіка 1995 года "Аб унясенні змяненняў і дапаўнення ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1995 г., N 18, арт. 199);
Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 ліпеня 1998 года "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., N 29-30, арт. 467);
пункт 8 артыкула 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2001 года "О признании утратившими силу законодательных актов и внесении изменений в некоторые законодательные акты Республики Беларусь по вопросам собственности" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2001 г., N 48, 2/759);
артыкул 10 Закона Рэспублікі Беларусь ад 24 ліпеня 2002 года "О внесении изменений и дополнения в некоторые законодательные акты Республики Беларусь в связи с реорганизацией системы республиканских органов государственного управления" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2002 г., N 87, 2/883);
Пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 1992 года "Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., N 30, арт. 505).

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь — А.ЛУКАШЭНКА

Дадатак 3 Да лекцыі 5

Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов
Республики Беларусь 30 апреля 2008 г. N 8/18715

**ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**11 красавіка 2008 г. N 13**

**АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ПАЛАЖЭННЯ АБ АЎТЭНТЫЧНЫМ ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВЕ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ**

На падставе пункта 4 артыкула 24 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1991 года "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 2004 года Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:
1. Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб аўтэнтычным фальклорным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Прызнаць страціўшым сілу Палажэнне аб аўтэнтычным фальклорным гурце ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджанае Міністрам культуры Рэспублікі Беларусь 30 красавіка 1999 г. (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 1999 г., N 44, 8/361).

Міністр — У.Ф.МАТВЕЙЧУК

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА<br>Міністр працы<br>і сацыяльнай абароны<br>Рэспублікі Беларусь<br>У.М.Патупчык<br>11.04.2008 | УЗГОДНЕНА<br>Першы намеснік<br>Міністра фінансаў<br>Рэспублікі Беларусь<br>А.М.Харкавец<br>11.04.2008 |
| УЗГОДНЕНА<br>Старшыня<br>Брэсцкага абласнога | УЗГОДНЕНА<br>Старшыня<br>Віцебскага абласнога |

Репозиторий ВГУ

выканаўчага камітэта
К.А.Сумар
04.04.2008

выканаўчага камітэта
У.П.Андрэйчанка
14.04.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.С.Якабсон
08.04.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.Я.Саўчанка
08.04.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
Б.В.Батура
08.04.2008

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
Л.Ф.Крупец
03.04.2008

УЗГОДНЕНА
Першы намеснік
старшыні
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
А.Я.Кунцэвіч
04.04.2008

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
11.04.2008 N 13

## ПАЛАЖЭННЕ
## АБ АЎТЭНТЫЧНЫМ ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВЕ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

1. Палажэнне аб аўтэнтычным фальклорным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь (далей - Палажэнне) вызначае асноўныя прынцыпы дзейнасці, умовы стварэння і функцыянавання аўтэнтычных фальклорных калектываў мастацкай творчасці з мэтай захавання аўтэнтычных формаў арыгінальнай фальклорнай культурнай традыцыі беларускага народа вуснага тыпу, якая з'яўляецца выразнікам нацыянальнай культурнай самабытнасці, мае самадастатковую духоўную каштоўнасць, а таксама з'яўляецца асновай для другаснага (секундарнага) фальклору, арганізавана-аматарскіх формаў народнай творчасці, творчай дзейнасці прафесійных і непрафесійных (аматарскіх) калектываў мастацкай творчасці.

2. У гэтым Палажэнні прымяняюцца наступныя асноўныя паняцці і іх азначэнні:

2.1. аўтэнтычны фальклор - спецыфічная галіна духоўнай культуры, якая аб'ядноўвае ўсе віды творчай дзейнасці - славесную, музычную, танцавальную, народныя абрады, народны тэатр, прыкладное мастацтва ў іх спрадвечным, адэкватным генетычным вытокам выглядзе, без якіх-небудзь апрацовак. Функцыянуе ў натуральным асяроддзі, існуе як вусная традыцыя, праяўляе сябе як калектыўная свядомасць, псіхалагічна арыентаваная на непасрэдныя, нефармальныя адносіны;

2.2. другасны (секундарны) фальклор - фальклор розных відаў і жанраў, прыстасаваны для непрафесійных (аматарскіх) калектываў мастацкай творчасці. Можа існаваць у апрацоўках і прыстасаваны пераважна для сцэнічных умоў;

2.3. носьбіты аўтэнтычнага фальклору - фізічныя асобы, якія звязаны з натуральным фальклорным асяроддзем канкрэтнай мясцовасці, атрымалі, захоўваюць, развіваюць і перадаюць аўтэнтычныя фальклорныя веды і навыкі ў парадку вуснай традыцыі;

2.4. аматары аўтэнтычнага фальклору - фізічныя асобы, якія сумесна ці паасобку на грамадскіх пачатках набываюць веды і навыкі розных праяў аўтэнтычнага фальклору, прымаюць удзел у захаванні, развіцці і перадачы аўтэнтычнага фальклору ў мэтах задавальнення сваіх духоўных запатрабаванняў;

2.5. аўтэнтычны фальклорны калектыў мастацкай творчасці (далей - фальклорны калектыў) - гэта калектыў, які складаецца з фізічных асоб, носьбітаў аўтэнтычнага фальклору, якія сумесна займаюцца мастацкай творчасцю.

3. Аўтэнтычны фальклор мае матэрыяльныя і нематэрыяльныя формы існавання (праявы).

Да матэрыяльных праяў аўтэнтычнага фальклору адносяцца па-мастацку афармленыя прадметы побыту, прылады працы, касцюм, жыллё, мэбля, посуд, выробленыя з прымяненнем мясцовых прыродных матэрыялаў (дрэва, гліны, саломы, лазы, ільну, воўны і іншых) па традыцыйных тэхналогіях.

Да нематэрыяльных праяў аўтэнтычнага фальклору адносяцца абрадавыя дзеянні, гульні, песенны, інструментальны, танцавальны, празаічны фальклор і іншае.

Репозиторий ВГУ

4. Асноўным прынцыпам захавання аўтэнтычнага фальклору ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца прызнанне існавання аўтэнтычнага фальклору як самастойнага, арыгінальнага тыпу культуры, заканамернасці якога прынцыпова адрозніваюць яго ад культуры іншых тыпаў.

5. Дзейнасць фальклорнага калектыву павінна быць скіравана на захаванне ў натуральных умовах праяў аўтэнтычнага фальклору сваёй мясцовасці, такіх як:

абрады і звычаі каляндарнага і сямейна-бытавога цыклаў;

традыцыйныя формы адпачынку і заняткаў характэрнымі відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

уласцівыя для спантанных праяўленняў традыцыйнай мастацкай культуры спевы, ігра на музычных інструментах, танцы, гульні ў натуральным асяроддзі;

рэгіянальныя песенныя, інструментальныя, танцавальныя, гульнёва-мастацкія стылі;

традыцыйныя склады калектываў спевакоў, музыкантаў, танцораў;

перадача фальклорных ведаў і навыкаў дзецям і моладзі, якія далучаюцца да традыцыйнай фальклорнай спадчыны сваёй мясцовасці ў парадку вуснай традыцыі натуральным шляхам;

выраб нацыянальнага адзення ў мясцовых традыцыях;

іншыя праявы.

6. Фальклорны калектыў у сваёй цэласнасці ці асобных праявах:

6.1. з'яўляецца:

адным з фактараў існавання праяў аўтэнтычнай традыцыйнай культуры;

носьбітам адметных для традыцыйнай культуры з'яў і працэсаў;

вынікам і сведчаннем недаследаваных працэсаў;

матэрыяльным аб'ектам і нематэрыяльнай з'явай, характэрнай для культуры нацыі;

6.2. мае:

адметныя, характэрныя для пэўнага рэгіёна краіны культурныя традыцыі;

традыцыйныя тапанімічныя назвы;

рэдкія і адметныя ўзоры:

прадметаў побыту і іншага прызначэння пэўных гістарычных перыядаў і рэгіёнаў;

пэўных стылістычных накірункаў рэгіянальных і этнічных асаблівасцей традыцыйнага мастацтва;

мастацкіх твораў розных відаў народнай творчасці пэўнага гістарычнага перыяду, рэгіёна і этнічнай групы.

7. Фальклорны калектыў можа ажыццяўляць сваю дзейнасць на базе арганізацый культуры, грамадскіх аб'яднанняў, творчых саюзаў і іншых арганізацый.

8. Назва фальклорнага калектыву павінна ўключаць словы "аўтэнтычны фальклорны".

9. У штат установы культуры, на базе якой ажыццяўляецца дзейнасць фальклорнага калектыву, са згоды заснавальніка ўстановы культуры можа ўводзіцца штатная адзінка кіраўніка фальклорнага калектыву.

10. Арганізацыя, на базе якой функцыянуе фальклорны калектыў, па магчымасці прадастаўляе асобнае памяшканне, абсталяванне, музычныя інструменты, сродкі для фіксацыі твораў традыцыйнай культуры і пераводу іх у пісьмовыя формы (аўдыё-, фота-, відэаапаратура і іншыя), дапамагае ў аднаўленні і стварэнні касцюмаў на аснове мясцовых аўтэнтычных строяў, стварае іншыя неабходныя для забеспячэння дзейнасці фальклорнага калектыву ўмовы.

11. Прыярытэтным накірункам дзейнасці кіраўніка фальклорнага калектыву з'яўляецца забеспячэнне дзейнасці фальклорнага калектыву з мэтай захавання аўтэнтычнага фальклору ў адпаведнасці са спецыфікай фальклорнага калектыву.

12. Кіраўнік фальклорнага калектыву:

садзейнічае захаванню асяроддзя, неабходнага для натуральнага функцыянавання традыцыйных формаў мясцовай мастацкай культуры;

стварае ўмовы для пераходу розных відаў і жанраў традыцыйнай культуры з пасіўнага стану ў актыўныя формы іх бытавання. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца каранёваму (абрадаваму) пласту;

непасрэдна ўдзельнічае ў традыцыйных святах і абрадах;

актыўна далучае да мастацкіх традыцый дзяцей і моладзь;

ініцыіруе вывучэнне традыцыйнага фальклорнага мастацтва;

падтрымлівае мастацкае самапраяўленне носьбітаў традыцый у іх спантанных формах у натуральным асяроддзі;

устанаўлівае і падтрымлівае дзелавыя і творчыя сувязі з іншымі фальклорнымі калектывамі, навукоўцамі, дзеячамі культуры і мастацтва, якія займаюцца пытаннямі традыцыйнай культуры;

ажыццяўляе аўдыё-, фота- і відэафіксацыю твораў традыцыйнай культуры, робіць пісьмовае апісанне абрадавых дзеянняў, гульняў, песеннага, інструментальнага, танцавальнага, празаічнага фальклору розных жанраў (казкі, паданні, легенды, былічкі, прыказкі, прымаўкі) і іншых звычаяў і абрадаў;

стварае архіў аўдыё-, фота-, відэа-, пісьмова зафіксаваных твораў традыцыйнай культуры, прымае меры па яго захаванні і пастаянным папаўненні;

ініцыіруе арганізацыю неабходнай фінансавай, матэрыяльна-тэхнічнай дапамогі для падтрымкі творчай дзейнасці фальклорнага калектыву;

прымае іншыя меры па атрыманні метадычнага кансультавання, запісе, расшыфроўцы, распаўсюджванні і папулярызацыі твораў традыцыйнай культуры.

13. Прыярытэтнымі патрабаваннямі да кіраўніка фальклорнага калектыву з'яўляюцца:

веданне і вывучэнне гісторыі, этнаграфіі, фальклору адміністрацыйнага раёна, фальклорна-этнаграфічных асаблівасцей мясцовасці, у якой працуе;

валоданне беларускай мовай і адным з відаў традыцыйнага мастацтва.

Рэпазіторый ВГУ

14. Вынікі дзейнасці кіраўніка фальклорнага калектыву вызначаюцца па:

ступені паўнаты і інтэнсіўнасці дзейнасці фальклорнага калектыву ва ўмовах мясцовай несцэнічнай традыцыі (выкананні ў натуральных умовах каляндарных і сямейных абрадаў, наяўнасці аўтэнтычных касцюмаў, веданні мясцовых музычных, танцавальных традыцый, казак, паданняў, легенд і гэтак далей), садзейнічанні ў перадачы ўсіх праяў аўтэнтычнай традыцыйнай культуры дзецям і моладзі;

наяўнасці створанага архіва твораў традыцыйнай культуры, фонд якога складаюць якасна зафіксаваныя рознымі тэхнічнымі сродкамі матэрыялы ўсіх відаў і жанраў фальклору, характэрнага для дадзенай мясцовасці.

15. Адказнасць за захаванне і рацыянальнае выкарыстанне матэрыяльных каштоўнасцей, якія выкарыстоўваюцца ў фальклорным калектыве, нясе кіраўнік фальклорнага калектыву.

16. Фінансаванне дзейнасці фальклорнага калектыву ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

17. Умовы аплаты працы штатных работнікаў фальклорнага калектыву вызначаюцца заканадаўствам.

---

## Лекцыя 6. Сінкрэтызм фальклору.

***Тэрміналагічная база:*** Непадзельнасць элементаў слова, музыкі, танца, пантамімы ў традыцыйных відах мастацтва. Першасная непадзельнасць ранніх форм свядомасці, рэлігійнае, прадмастацкае і мастацкае мысленне (міфалогія).

## Лекцыя 7. Фальклор - творчасць працоўных, мастацкая дзейнасць непрафесіяналаў.

***Тэрміналагічная база:*** Сувязь фальклору з характарам дзейнасці чалавека. Значэнне фальклору ў жыцці працоўных ў перыяд дапісьменнай культуры, як крыніцы інфармацыі, своеасаблівага маральнага кодэксу, важнага сродку маральнага і эстэтычнага выхавання ў грамадстве.

## Лекцыя 8. Асаблівасці твораў народнай музычнай творчасці ў параўнанні з творамі прафесійнай музыкі.

***Тэрміналагічная база:*** Вусная прырода фальклорных твораў. Шматварыянтнасць існавання фальклорных твораў. Узаемадзеянне індывідуальнай і калектыўнай творчасці. Адсутнасць (у большай ступені) дакладнага індывідуальнага аўтарства, прыналежнасць да фальклорных твораў з адсутнасцю аднаго аўтара і папулярных у народзе аўтарскіх твораў. Залежнасць змястоўнасці, мастацкай, грамадска-гістарычнай значнасці фальклорных твораў ад маральных якасцяў, інтэлектуальных здольнасцяў творцаў, асяроддзя узнікнення і бытавання твораў. Сінкрэтызм у ранніх формах старажытнай культуры. Канкрэтнае бытавое прызначэнне твораў фальклору, характэрнае для раннетрадыцыйнай культуры.

## Лекцыя 9. Музычны фальклор як аснова нацыянальнай прафесійнай і аматарскай музычнай культуры. Сувязі паміж прафесійным і народным музычным мастацтвам.

***Тэрміналагічная база:*** Беларуская народная музычная класіка як узорная частка беларускай музычнай культуры. Беларускі нацыянальны стыль. Беларускі нацыянальны музычны стыль. Беларускае прафесійнае музычнае мастацтва. Беларускае самадзейнае музычнае мастацтва. Беларускі фальклор, беларускі музычны фальклор, як крыніца творчасці прафесійных і самадзейных мастацкіх творцаў.

Сувязі паміж прафесійным і народным музычным мастацтвам:

- цытаванне кампазітарамі ў сваіх творах асобных народных мелодый, непасрэднае выкарыстоўванне ў кампазітарскіх творах урыўкаў твораў музычнага фальклору без апрацоўкі, у арыгінале;
- стварэнне кампазітарамі сваіх асабістых твораў па музычных вобразах і інтанацыйна-меладычнаму складу падобных да народных;
- рэалістычнае ўключэнне ў оперную і праграмна-сімфанічную музыку розных відаў народнай песні, як грамадска-гістарычнай жанравай з’явы ў непарыўнай (сінкрэтычнай) сувязі з народным бытам, народнымі абрадавымі дзеяннямі, святамі, гульнямі, верай ці пэўнымі гістарычнымі абставінамі;

Рэпазіторый ВГУ

- шырокае ўключэнне кампазітарамі яркіх і выразных спецыфічных нацыянальных якасцяў народнай музычнай мовы: інтанацый, напеваў, меладычных абаротаў, рытмічнага складу, асаблівасцяў меладычнага развіцця (распеўнага ці папевачнага-варыянтнага), прыёмаў народнага шматгалосся;
- адлюстраванне ў кампазітарскіх творах народных ідэй, паэтычных сюжэтаў і вобразаў;
- выкарыстоўванне характэрных прыёмаў развіцця музычнага зместу.

**Лекцыя 10. Тэма 10.1. Жанр. Абумоўленасць узнікнення фальклорных жанраў.**

*Тэрміналагічная база:* Жанр. Сутнасць тэрміну. Жанравая прыналежнасць фальклорных твораў у залежнасці ад жыццёвага прызначэння, функцыі бытавання, гістарычных асаблівасцяў пэўнай эпохі.

**Тэма 10.2. Класіфікацыя фальклорных жанраў.**

*Тэрміналагічная база:* Класіфікацыя фальклорных жанраў: жанры драматычныя, жанры лірычныя, жанры эпічныя. Адлюстраванне спецыфікі структуры фальклору народу пэўнага рэгіёну, рэальных суадносін родаў, жанраў, відаў.

**Тэма 10.3. Жанравая разнастайнасць фальклорных твораў.**

***Тэрміналагічная база:*** Гістарычная абумоўленасць узнікнення фальклорных твораў.

***Першы гістарычны фальклорна-стылявы пласт раннетрадыцыйнай сялянскай класікі.*** Час фарміравання. Асяродак бытавання.

Песні каляндарна-земляробчага цыклу: зімовыя (калядныя, шчадроўскія, песні Васілля); масленічныя песні, веснавыя песні (заклічкі, загуканні, валачобныя, юраўскія, сёмушныя, куставыя, русальныя); летнія (купальскія, пятроўскія, жніўныя); восеньскія (яравыя, ільняныя); карагодна-гульнёвыя.

Песні сямейна-абрадавага цыклу: радзінныя, вясельныя, галашэнні.

Дзіцячы фальклор.

Сігнальныя і каляндарна-прымеркаваныя найгрышы ранняй інструментальнай музыкі.

Паставыя песні. Духоўныя вершы. Бяседныя і талочныя песні. Рускі эпас, быліны. Спецыфічныя рысы твораў першага гістарычнага фальклорна-стылявога пласта.

***Другі гістарычны фальклорна-стылявы пласт познетрадыцыйнай класікі.***

Час узнікнення і фарміравання. Асяродак бытавання. Мужчынская сацыяльная лірыка і эпас: чумацкія, бурлацкія, казацкія, гістарычныя, рэкруцкія, салдацкія песні. Бытавы фальклор: жартоўныя, любоўна-лірычныя, сямейна-бытавыя і іншыя пазаабрадавыя песні. Беларускі гераічны кант. Вызначальныя рысы Другога гістарычнага фальклорна-стылявога пласта.

***Трэці гістарычны фальклорна-стылявы пласт: Песні Змагання XIX пачатку XX ст.ст..***

Час узнікнення і фарміравання. Асяродак бытавання. Батрацкія, адыходніцкія, рабочыя, рэвалюцыйныя песні, літаратурныя песні на словы прафесійных паэтаў. Прыпеўкі. Адметныя рысы твораў Трэцяга гістарычнага фальклорна-стылявога пласта.

***Чацвёрты гістарычны фальклорна-стылявы пласт.*** Час узнікнення і фарміравання. Фальклор савецкага часу. Асяродак бытавання. Песні грамадзянскай вайны. Фальклор Заходняй Беларусі (1921-1939г.г.), песні Вялікай Айчыннай вайны, песні часоў сталінскіх рэпрэсій, пасляваенны песенны фальклор, жанры сучаснага фальклору (турысцкія, студэнцкія, салдацкія, дваравыя і інш. песні). Асаблівасці твораў Чацвёртага гістарычнага фальклорна-стылявога пласта.

**Лекцыя 11. Тэма 11.1.Раннетрадыцыйная музычная класіка.**

Репозиторий ВГУ

***Тэрміналагічная база:*** Сінкрэтызм, поліфункцыянальнасць, паліэлементнасць абрадавага фальклору. Строгая прымеркаванасць твораў раннетрадыцыйнай музычнай класікі да пэўнага часу ці абставін у сувязі з дакладнай абраднасцю ў мінулым і традыцыямі, асацыяцыямі ў наш час.

**Тэма 11.2.Агульная характарыстыка абрадавых песень.**

***Тэрміналагічная база:*** Фарміраванне так званых напеваў групавога прымацавання, напеваў-формул - гранічна сціслых устойлівых формул, якія характэрны пэўнаму жанру і абагульняюць некалькі тэкстаў.

**Тэма 11.3. Народная школа галоснага спеву.**

***Тэрміналагічная база:*** Своеасаблівая манера выканання старажытнай школы галоснага спеву. Аўтэнтычная вакальная традыцыя і яе спецыфіка (звонкія воклічы, глісандуючыя завяршэнні фраз, "рытуальныя шумы" - усялякага роду пастукванні, пабразгванні, прытанцоўкі, славесныя выкрыкі і г.д.).

Асаблівасці пазаабрадавых песень раннетрадыцыйнага перыяду.

**Лекцыя 12. Каляндарна-земляробчы цыкл абрадавых песень у сінкрэтызме з каляндарнымі традыцыямі.**

***Тэрміналагічная база:*** Абавязковыя рытуалы, накіраваныя на паляпшэнне дабрабыту сялянскай сям'і, на захаванне і працяг роду, на ўшанаванне продкаў, святаў, абрадаў народнага каляндара.

**Тэма 12.1.Народны каляндар.**

***Тэрміналагічная база:*** Прынцыпы і асаблівасці пабудовы народнага каляндара, знітаванне традыцый язычніцтва і хрысціянства ў абрадавай культуры беларусаў.

Гісторыя ўзнікнення каляндара, як крок да выпрацоўкі сістэмы летазлічэння. Вытокі старажытнага славянскага каляндара ў земляробчым каляндары беларусаў. Каляндар земляроба ў валачобных песнях Вялікадня.

**Тэма 12.2. Веснавыя святы, абрады, звычаі.**

***Тэрміналагічная база:*** Гуканне вясны: магічна-заклінальны характар у старажытнасці, час загукання, сутнасць абраду, аграрна-земляробчы характар гукання, салярныя культы - раскладванне вогнішча, ваджэнне карагодаў "па сонцу", культ прыроды, птушак (птушка, як сімвал вясны, дабра). Рытуальная ежа: яйкі, малочныя стравы. Птушкі: жаўрук, бусел, ластаўка, зязюля (Жыва - багіня Вясны) ў веснавой абраднасці. Веснавыя прыкметы.

Дзень Аўдоцці Вясноўкі (Еўдакеі). Саракі, Благавешчанне, Вербніца ў жыцці старажытных славян.

Вялікдзень - найстаражытнейшае славянскае свята сустрэчы новага года вясною па каляндары земляроба. Ачышчальныя абрады вадой (абліванне, каб выгнаць злых духаў і быць здаровымі ўвесь год), агнём (спальванне смецця і ўсяго благога), ветрам (гойданне на арэлях). Культ Сонца (вогнішча), вады, прыроды (вецер, ахвяры полю і яго духам), продкаў (пакланненне дзядам). Рытуальная ежа: фарбаваныя яйкі, хлеб (каравай), свініна (сувязь з культам Сонца). Аграрны характар свята. Вялікодныя гульні, забавы (гульня ў біткі, качанне яек), звычаі (наведванне гасцей на другі дзень).

Валачобны абрад. Этымалогія (паходжанне) назвы. Сутнасць абраду ў старажытнасці. Драматургія абраду. Агульныя і спецыфічныя рысы ў параўнанні з абрадам калядавання.

Радаўніца, радуніца. Сутнасць свята. Рэгіянальныя, лакальныя традыцыі.

Юр'еў дзень, як дзень надыходу сапраўднай Вясны, свята ўрадлівасці, дзень першага выгану жывёлы ў поле. Час святкавання, мэта святкавання ў старажытнасці. Бог Ярыла, як папярэднік святога Юр'я, Георгія Пераможцы, яго функцыі. Аграрны характар свята. Абрады, звязаныя з культам сонца, вады (юраўская раса), прыроды. Рытуальная ежа. Эратычныя элементы юраўскіх абрадаў. Юраўскія павер'і і варожбы. Абрад ваджэння і пахавання "стралы". Рэгіянальныя, лакальныя асаблівасці святкавання.

Сёмуха. Этымалогія назвы. Асэнсаванне сёмушных і траецкіх традыцый. Абрадавыя дзеянні, звязаныя з культам расліннасці. Культ бярозы, завіванне бярозы. Абрад кумлення - своеасаблівая форма

Репозиторий ВГУ

ініцыяцыі (прыняцце ў “род жанчын” дзяўчат, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту). Абрадавыя дзеянні, звязаныя з сімвалам вянка. Абрадавая трапеза і рытуальная ежа. Сёмушныя варожбы. Развіванне бярозкі, раскумленне. Рытуал абыходу палёў. Абрадавая расправа з сяміцкай бярозкай. Культ вады. Абрад ваджэння Куста і вера ў асаблівую магічную сілу траецкай зеляніны. Этымалогія назвы куставога абраду. Час ваджэння куста. Удзельнікі абраду. Спецыфіка абыходу двароў. Аграрна-магічныя і любоўна-шлюбныя элементы абраду. Абрадавая расправа з Кустом і яе сэнс.

Памінальныя матывы Сёмухі. Узаемасувязь культа продкаў і аграрнай магіі ў светапоглядах старажытных землеробаў. Веснавыя Дзяды. Час святкавання. Падрыхтоўка да свята. Ахвярапрынашэнні Дзядам. Рытуальныя нормы паводзін. Абрадавая трызна і рытуальная ежа. Траецкія вогнішчы і культ продкаў.

Русальны або Граны тыдзень. Этымалогія назвы. Час адзначэння. Сутнасць абраду “праводзін русалкі”. Удзельнікі абрадавага дзеяння. Асэнсаванне вобразу русалкі ў старажытнасці з галізнай, вадзянымі жаночымі істотамі, якія забяспечваюць зямлю вільгаццю, з душамі памерлых ненатуральнай, заўчаснай, смерцю дзяўчынак і дзяўчат. Аграрны культ, культ агня, вады, вянка ў русальнай абраднасці. Провады русалкі і завяршэнне цыклу веснавых святаў.

**Тэма 12.3.Веснавыя песні.**

***Тэрміналагічная база:*** Веснавыя заклічкі (загуканні) - вяснянкі. Валачобныя песні. Веснавыя карагоды. Траецкія або сёмушныя песні. Куставыя песні. Русальныя песні. Песні, прымеркаваныя да веснавога перыяду.

Характарыстыка формульных напеваў. Тыпы веснавых песень. Паэтыка і кола вобразаў веснавых песень і іх цесная сувязь з веснавой абраднасцю.

**Тэма 12.4. Летнія абрады і святы.**

***Тэрміналагічная база:*** Купалле. Паходжанне назвы. Мэта святкавання ў старажытнасці. Купала, як адно з галоўных язычніцкіх бажаствоў. Салярны культ. Культ вады. Культ расліннасці. Эротыка і Купалле. Рытуальныя купальскія стравы. Купальская варожба. Кумленне на Купалле. Купальскія паданні і легенды. Элементы купальскага карнавалу. Драматургія купальскага свята.

Пятроў дзень. Пятроўка. Сутнасць свята, час святкавання, традыцыі.

Жніво. Аграрная і магічная скіраванасць абрадаў. Падрыхтоўка да жніва. Зажынкі - пачатковы этап жніва. Колькасць удзельнікаў абраду зажынак. Значэнне першага снапа, рытуальнай ежы. Патрабаванні да зачынальніцы. Святочная зажыначная вячэра. Адсутнасць абрадаў ва ўласна жніве. Этнапсіхалагічныя асаблівасці жняяркі, жаданне выказаць сваю крыўду, гора полю, ніве. Завяршальны этап жніва - дажынкі. Жніўная талака. Дажыначны вянок. Рытуальная ежа - ніве. Абрад “Завівання барады”. Рэгіянальныя, лакальныя асаблівасці абраду. Сэнс, аграрны магічны характар абраду.

Калектыўнае частаванне жніўнай талакі, як частка абрадавых дзеянняў. Дажынкавыя абрадавыя стравы. Рэгіянальныя асаблівасці дажыначнага стала. Абрады, накіраваныя на захаванне плёну, памнажэнне ўрадлівасці збажыны.

**Тэма 12.5. Летнія песні.**

***Тэрміналагічная база:*** Купальскія, пятроўскія песні. Час выканання, іх функцыянальнае прызначэнне. Вобразы і паэтыка купальскіх песень. Характарыстыка тыповых формульных напеваў.

Жніўныя песні (зажынкавыя, уласна жніўныя, дажынкавыя) і іх спецыфіка. Характарыстыка тыповых формульных напеваў. Тэматыка, кола вобразаў, паэтыка песень.

Карагодна-гульнёвыя летнія песні. Летнія песні, звязаныя з відамі летняй працы: сенакос (касьба), збіранне ягад і г.д.

**Тэма 12.6. Восеньскія абрады і святы.**

Репозиторий ВГУ

***Тэрміналагічная база:*** Прычыны сціпласці восеньскіх звычаяў і абрадаў. Ілля - свята мяжы лета і восені. Паходжанне назвы, сутнасць свята. Спас: І-ы Спас Мядзяны - свята маку, ІІ-і Спас Яблычны - свята садавіны, ІІІ-і Спас Хлебны - свята хлеба. Сутнасць святкавання, прыкметы, павер'і. Восеньскае (аўсяное) жніво. Засеўкі. Падрыхтоўка да засевак. Абрад выбару першага гаспадара для пасеву. Традыцыйныя дзеянні ў час пасеву. Значэнне ўрачыстай вячэры пасля засевак.

"Жаніцьба коміна", "Жаніцьба пасвета" - традыцыйныя святы пакланення агню. Вобраз бога Сварожыча ў язычніцкім светапоглядзе старажытных славян і яго функцыі ў свяце Агню.

Багач. Магчымае асэнсаванне назвы свята з язычніцкім богам Сонца - Дажбогам і днямі восеньскага сонцастаяння. Роля лубкі (напоўненай жытам і ўстаўленай у яе свечкі) ў абрадзе. Абрадавыя дзеянні са свойскай жывёлай. Перадача "багача" па хатах. Пачатак выгледзін, перапытаў для будучых вяселляў.

Дні памінання продкаў. Восеньскія Дзяды. Лакальныя назвы і іх паходжанне. Час святкавання. Падрыхтоўка да свята. Патрабаванні да ўрачыстай вячэры. Звычаі, абрады памінальнай вячэры. "Размова" з душамі продкаў. Святкаванне Дзядоў Родамі, сем'ямі на Дзісненшчыне. Звычаі пячэння бахонкаў, упісвання і выпісвання з сямейнай хронікі членаў сям'і. Абрады ачышчэння. Павер'і, прыгаворы ў час памінання продкаў.

Піліпаўка або Запусты - перыяд перадкаляднага посту: сутнасць, звычаі, абрады.

Талака: веснавая, летняя, восеньская. Талочныя песні.

**Тэма 12.7.Восеньскія песні.**

***Тэрміналагічная база:*** Перыяд гучання. Сувязь з восеньскімі абрадамі. Сціпласць песеннай разнастайнасці. Пераважнае размяшчэнне ў Паазер'і. Тэматыка, паэтыка песень. Характарыстыка напеваў.

Піліпаўскія песні.

**Тэма 12.8. Зімовыя святы, абрады, звычаі.**

***Тэрміналагічная база:*** Каляды: паходжанне назвы, час святкавання, сутнасць святкавання ў старажытнасці. Тры куцці - абрадавыя вячэры. Час адзначэння, варожбы, прыкметы, падрыхтоўка да святкавання. Уласна куцця, як абрадавая страва: сакраментальны сэнс стравы, спецыфіка прыгатавання, прыкметы, варожбы, звычаі, звязаныя з кашай-куццёй.

Калядаванне: сутнасць абраду, мэта калядавання ў старажытнасці, удзельнікі абраду і іх функцыі, драматургія калядавання, выкарыстоўванне дэкаратыўна-прыкладной атрыбутыкі ў калядаванні, харэаграфічныя элементы ў калядных абрадах.

Батлейка (лялечная, жывая) у калядна-абыходным абрадзе.

Адсутнасць калядавання ў пэўных рэгіёнах, дзе распаўсюджаны валачобны абрад.

Шчадраванне - спецыфіка і сутнасць абрадавага абыходу двароў, паходжанне назвы.

Значэнне пераапранання ў жывёл (у казу, мядзведзя, кабылу, жорава і інш.) у калядных абрадах, яго сувязь з зааморфным характарам язычніцкай веры старажытных славян.

Святочныя ці "крывыя" вечары. Калядныя гульні, забавы. Пераапрананне на святыя вечары ў Дзеда Каляду, цыгана, барыню, афіцэра, папа, купца, яўрэя, мельніка, смерць, дзятла, асла, вала, курыцу і інш. Гомельскія "хохі". Брэсцкая "Рашатуха". Калядныя вечарыны ў хаце, карчме. Разнастайнасць і багацце гульняў і забаў.

"Жаніцьба Цярэшкі" - калядная гульня Паазер'я. Паходжанне назвы гульні. Ідэя правядзення ў старажытнасці і яе трансфармацыя ў познія часы. Падрыхтоўчы этап да гульні. Дзеючыя асобы гульні і іх функцыі. Драматургія гульні.

"Зязюля" - старажытная гульня. Сэнс гульні, яе змест. Разнастайнасць калядных гульняў і карагодаў: "Яшчур", "Халімон", "Кралька", "Падушачка", "Я еду бел маладзец", "Царыў сын каралёў", "Чарнец", "Мак", "Гусачок", "Канапелькі" і інш.

**Тэма 12.9. Зімовыя песні.**

Репозиторий ВГУ

***Тэрміналагічная база:*** Агульная характарыстыка зімовых песень, іх сувязь з зімовымі святамі, абрадамі, звычаямі. Калядныя песні: прызначэнне, сталыя рэфрэны. Тыпы жанру калядных песень паводле зместу: калядныя- абыходныя (агульныя, гаспадару, гаспадыні, сыну, дачцэ, малым дзецям, дзеду, старой, жартоўныя канцоўкі да песень); калядныя- гуллівыя: песні з цыклу "Каза" і міфалагічны, зааморфны характар вобразу Казы ў калядных абрадах і песнях, сувязь са жніўным абрадам "Завіванне барады". Цярэшкі - прыпеўкі гульні "Жаніцьба Цярэшкі", кола вобразаў, сувязь драматургіі гульні з прыпевачным суправаджэннем Цярэшак. Высокі ўзровень харэаграфічнага, музычнага, выканаўчага, імправізацыйнага майстэрства лепшых удзельнікаў гульні.

Зімовыя гульні, карагоды - агульная характарыстыка меласу, зместу, паэтычных вобразаў.

Шчадроўскія песні, песні Васілля, песні, прымеркаваныя да Калядаў. Багацце паэтычных, музычных вобразаў зімовых песень.

**Тэма 12.10.Масленіца. Масленічны тыдзень.**

***Тэрміналагічная база:*** Паходжанне назвы. Спецыфіка, час святкавання. Мэта святкавання ў старажытнасці. Прыбліжэнне святкавання беларускай масленіцы да веснавой абраднасці. Багацце, спецыфічнасць звычаяў, абрадаў беларускай масленіцы ва ўсходніх і цэнтральных раёнах Беларускага Паазер'я і іх адрозненне ад рускай, украінскай абраднасці.

Сутнасць масленічных беларускіх абрадаў сямейна-родавага культу: калодкі, звычаі ўшанавання маладух, наведванне павівальных бабак; аграрнага культу: гушканне на арэлях, коўзанне на ледзяных і снегавых горках, закапванне маладых у снег, абсыпанне снегам, спальванне снапа саломы, ваджэнне "казы" ў некаторых раёнах.

Масленічныя гульні, забавы ("Шуцейныя памінкі дзеда" на Віцебшчыне і інш.)

**Тэма 12.11. Масленічныя песні.**

***Тэрміналагічная база:*** Кола паэтычных вобразаў. Музычныя асаблівасці. Спецыфічныя масленічныя рэфрэны. Рэгіёны распаўсюджвання і лакальныя тыповыя напевы.

Непарыўнае кола песеннай і абрадавай традыцыі ў старажытным каляндары беларусаў.

**Лекцыя 13. Тэма 13.1. Сямейна-абрадавы музычны фальклор у традыцыйнай культуры беларусаў.**

Агульная характарыстыка сямейных абрадаў, звычаяў, павер'яў.

**Тэма 13.2.Радзіны на Беларусі.**

***Тэрміналагічная база:*** Мэта адзначэння. Асноўныя ўдзельнікі абраду і іх функцыі. Абрадавае рэгуляванне паводзін цяжарнай жанчыны. Адведкі. Радзіны (Хрэсьбіны) і іх змест. Традыцыйная падрыхтоўка да ўрачыстасці, радзіннае застолле і яго сутнасць, "бабіна каша", "наезды бабкі" і іншыя рытуальныя дзеянні. Прыкметы і павер'і, звязаныя з першымі гадамі жыцця дзіцяці. Рытуалы першых дзён жыцця дзіцяці.

**Тэма 13.3.Радзінныя песні.**

***Тэрміналагічная база:*** Класіфікацыя і тыпалогія радзінных песень. Магічная функцыя радзінных песень. Тэматыка, паэтыка, сімволіка радзінных песень. Характарыстыка напеваў. Значэнне жартоўных песень у радзінных абрадах.

**Тэма 13.4.Вясельныя звычаі і абрады.**

***Тэрміналагічная база:*** Шлюб: мінулае і сучаснасць. Сутнасць старажытных шлюбных адносін і іх трансфармацыя.

Традыцыйнае Вяселле.

Падрыхтоўчы этап да Вяселля: перапыты, сватанне, агледзіны, запоіны, заручыны - сутнасць, абрады, традыцыйныя дзеянні.



Репозиторий ВГУ

Каравайны абрад і яго месца ў вясельным святкаванні. Міфалогія і сімволіка каравайнага абраду. Традыцыйныя дзеянні.

Вясельны абрад "ёлкі" (гільца, ельца). Зборная субота. Мясцовыя назвы абраду. Драматургія вечара. Сімвал вянка і яго значэнне ў абрадзе "віцця вянкоў". Характарыстыка І-ай часткі зборнага вечара. Пасад маладой у зборную суботу і часанне касы. Развітанне маладой з "дзявоцкім пагуляннем". Збор радні маладой у зборны вечар.

Уласна вяселле: зачынанне вясельнай урачыстасці. Бацькава блаславенне. Роля дзядзькі (брата маці) і брата маладой у вясельным абрадзе. Стаўбавы абрад, характэрны раёнам Паазер'я.

Прыбіранне маладой. Значэнне каліны, руты, мяты і інш. кветак ва ўпрыгожванні маладой. Рытуал расплятання і часання касы і яго месца ў вясельнай абраднасці. Сімвал касы ў вясельных абрадах. Расплятанне касы як пачатак пасаду нявесты. Пасад нявесты.

Падрыхтоўка да вяселля ў доме маладога. Пасад жаніха і яго значэнне ў вясельнай абраднасці. Прыезд маладога да маладой. Сумесны пасад. Сэнс сумеснага пасаду ў старажытнасці. Падрыхтоўка маладых да шлюбу. Ад'езд да шлюбу.

Звычаёвы абрад шлюбу і царкоўнае вянчанне. Адносіны да свецкай і царкоўнай цырымоніі ў народзе. Павер'і, звязаныя з цырымоніяй вянчання. Адзінства язычніцкіх і хрысціянскіх вераванняў у вянчальным абрадзе.

Сустрэча маладых пасля вянчання ў доме маладой. Ад'езд маладога па сваю дружыну і звычаёвыя правілы паводзін маладой у гэты час. Чаканне маладой прыезду маладога.

Санкцыяніраванне шлюбнага саюзу абшчыны, роду, суседзяў пры дапамозе пэўных рытуальных дзеянняў, песень, прыгавораў.

Выкраданне і купля-продаж нявесты - традыцыйная абрадавая вясельная гульня. Сэнс абраду ў старажытнасці. Асэнсаванне пахода за нявестай як ваеннага нападу на двор маладой. Пераадоленне дружынай маладога разнастайных перашкод - "узброеных" вясельнікаў з боку нявесты, "бой" перад варотамі двара маладой. Трасфармацыя абрадавага дзеяння ў познія часы.

Рытуал яднання родаў маладых, саміх маладых: злепліванні "свячэй да купы", звядзенне караваяў і інш. Абрады цырымоніі заключэння саюза паміж двума родамі. Роля сватоў, дзяўчат у абрадавым дзеянні.

Традыцыі ўваходу ў хату маладой дружыны маладога. Сустрэча цешчы і зяця - багацце і складанасць сімволікі абраду.

Пачуцці маладых, сяброўак у час зводзін. Рытуал "раўнавання" (роўнасці маладых).

Вяселле ў маладой: абрад абмену падарункамі паміж дружынамі маладога і маладой - яднанне абодвух родоў. Абрад адорвання ў беларускім вяселлі. Надзяленне маладой, абдорванне маладой роду маладога.

Старажытны звычай арганізацыі вясельнага застолля. Сімвал сумеснай ежы, як своеасаблівы акт пэўнай дамоўленасці.

Развітанне маладой з дзявоцтвам і сяброўкамі, як значная частка вясельнага застолля ў маладой. Развітанне з бацькамі, родам, рэчамі, прадметамі хатняга ўжытку, пабудовамі.

Адносіны роду, усіх прысутных да маладой. Галашэнне маладой і яе маці - традыцыйны абрад на Віцебшчыне.

Вобраз свякровы, заловак у вясельным застоллі.

Абрады, звычаі ад'езду маладой з дому. Вясельны поезд па дарозе да маладога: павер'і, звычаі, традыцыі.

Мажорны характар абрадаў вяселля ў маладога. Псіхалагічны стан нявесты ў доме жаніха.

Вобраз маці жаніха. Чаканне сына. Падрыхтоўчы рытуал сустрэчы маладых. Сімвалы агню, жыта ў рытуалах сустрэчы маладых. Вобраз маладой як сімвал пладавітасці, дабрабыту, здароўя, шчасця, багацця.

Паводзіны свякровы ў час сустрэчы з нявесткай. Роля хросных бацькоў, бацькі маладога ў сустрэчным рытуале. Татэм мядзведзя і яго роля ў сустрэчы маладых. Сімвал парога і яго значэнне ў вясельнай абраднасці.

Сустрэча маладой з родам маладога. Кароткае застолле ў доме маладога і яго спецыфіка.

Рэпазіторый ВДУ

Маруднасць адаптацыі маладой у новай сям'і. Адносіны да маладой з боку свякровы, свёкра, заловак, усяго роду.

Абрад клеці (пакладзін, "Калінка"): прывоз пасцелі вячэрнікамі, суправаджэнне ў клець маладых, абрад пакладзін і значэнне ў ім абрадавай ежы, зёлак і інш. Вывад маладых з клеці і абрадавыя традыцыйныя дзеянні.

Абрады прывозу і выкупу пасагу.

Чаканне маладой сваіх бацькоў.

Абрад "завівання маладой". Надзяванне чапца, выкуп маладой ў завівальніцы. Замена ручнікоў, застольнікаў у доме маладога. Частаванне маладой гасцей закускай, якую прывезла яе маці ці абрадавай стравай асабістага прыгатавання. Падзел каравая. Адорванне маладых. Вясельныя маршы.

Вясельныя гульні.

Ад'езд радні маладой дадому.

Пярэзвы.

**Тэма 13.5.Вясельныя песні.**

***Тэрміналагічная база:*** Дамінаванне вясельных песень ў сямейна-абрадавым цыкле. Функцыянальны, жанравы, тэматычны прынцып класіфікацыі вясельных песень. Значэнне вясельных напеваў у драматургіі вясельнага абраду. Традыцыйнае вяселле - своеасаблівая народная опера.

Характарыстыка тыповых напеваў, вясельных песень, характару гучання. Інтанацыйны змест вясельных напеваў. Класічны комплекс вясельнага песеннага рытуалу Паазер'я. Аналіз меласу вясельных песень і змяненне кампазіцыі напеваў па ходу руху з усходу на захад і з поўначы на поўдзень. Тыпалогія вясельных песень.

Галашэнні ў беларускай вясельнай традыцыі.

Вясельная танцавальная традыцыя.

**Тэма 13.6 .**Пахаванне, хаўтуры, цыкл сямейных звычаяў і абрадаў, звязаных з ушанаваннем памяці нябожчыка і праводзінамі яго ў апошні шлях.

Старажытныя абрады трупаспалення і трупапалажэння, замацаванне апошняга ў традыцыі хрысціянства. Спецыфіка і этапы пахавальных абрадаў.

Галашэнні і іх функцыя ў пахавальных абрадах. Значэнне інструментальнага фальклору, роля музычных народных інструментаў у пахаванні. Значэнне смеху, дзейнасці скамарохаў у пахавальнай абраднасці старажытных славян.

Філасофскае разуменне жыцця і смерці ў традыцыйнай культуры беларусаў.

**Лекцыя 14. Беларускія народныя музычныя інструменты і беларускае народнае музычнае выканаўства.**

**Тэма 14.1. Народныя музычныя інструменты на Беларусі.**

***Тэрміналагічная база:*** Асаблівасці беларускага народнага музычнага інструментарыя. Сучасная класіфікацыя беларускіх народных музычных інструментаў. Месца народных музычных інструментаў у традыцыйнай культуры беларусаў.

Традыцыйныя музычныя інструменты, прырода ўзнікнення. Гістарычны шлях фарміравання беларускага народнага музычнага інструментарыя. Найстаражытнейшая група музычных інструментаў і інструменты, якія да яе належаць: лісты дрэў, травы, карынка, берасцянка, жужжалка, чурынга, труба, рог, бандурка, калотка, біла, бразготкі, капшук і інш. Агульны выгляд, спецыфіка гучання і тэхніка ігры.

Музычныя інструменты больш позняга перыяду: талеркі, вугольнік, кляшчоткі, трашчоткі, звон, званкі, шархуны, бубен, барабан, брусочкі.

Музычныя інструменты з дакладнай фіксацыяй гуку - новы этап на гістарычным шляху фарміравання музычнага інструментарыя: свісцёлка, дудка, жалейка, чаротка, балалайка, цытра, ліра колавая, басэтля, смык, скрыпка, дуда, пішчык, цымбалы.

Народныя музычныя інструменты XIX-XX стагоддзяў - гармонік, акарына. Агульны выгляд, спецыфіка гучання, асаблівасці тэхнікі ігры.



Репозиторий ВГУ

Самаробныя музычныя інструменты ў дзіцячым побыце (грэбень, палачкі і інш.), тэхніка вырабу і спосабы выкарыстоўвання.

**Тэма 14.2. Народныя музыкі на Беларусі. Індывідуальныя выканаўцы.**

***Тэрміналагічная база:*** Скамарохі на Беларусі - старажытнейшыя акцёры-выканаўцы, носьбіты інструментальнай музычнай традыцыі. Батлеечнікі і музыкі: дудары, скрыпачы, цымбалісты, бубністы і інш. - прадаўжальнікі традыцый музычнага выканаўства скамарохаў, любімцы народу. Багацце таленту беларускіх музыкаў - народных музыкантаў- прафесіяналаў, віртуознасць інструментальнага майстэрства.

Асаблівы статус носьбітаў музычнага фальклору. Патрабаванні да народных музыкаў: высокі ўзровень ігры на музычных інструментах (тэхніка, майстэрства сольнай імправізацыі, ансамблевы навык, уменне самім вырабляць свае інструменты). Асновы традыцыйнага музычна-педагагічнага майстэрства.

**Тэма 14.3. Народныя музыкі на Беларусі. Народныя ансамблевыя гурты.**

***Тэрміналагічная база:*** Стыхійна арганізаваныя аркестры і іх функцыя. (…)

**Тэма 14.4. Інструментальная народная музыка.**

***Тэрміналагічная база:*** Традыцыйныя ўяўленні народа пра гукавыя характарыстыкі музычных інструментаў. Паняцце інструментальнага ладу ў народнай традыцыі.

Музычная сістэма найгрышаў (сігнальных, гукапераймальных, песенных, танцавальных, маторна-рухальных).

Жанры традыцыйнай танцавальнай музыкі: полька, вальс, марш, мазурка, абэрак, кадрылі і інш. Іх лакальныя разнавіднасці. Узаемасувязь інструментальнай і танцавальнай традыцыі.

**Лекцыя 15. Песні з умоўным прымеркаваннем па часе і абставінах выканання.**

***Тэрміналагічная база:*** Строгая прымеркаванасць па часе і абставінах выканання ва ўмовах дакладнага рэгламенту традыцыі найважнейшых сямейна-абрадавых цырымоній і земляробчых святочных дзеяў - ядро класічнай раннетрадыцыйнай музыкі.

Спецыфіка жанраў не строгай (умоўнай) прымеркаванасці выканання да пэўных перыядаў, відаў работ, грамадска значных бытавых з’яў.

Класіфікацыя ўмоўна прымеркаваных песень: запусныя, вясноўскія, талочныя, летнія, асеньскія, піліпаўскія (ражстоўскія), бяседныя. Дэталізаваныя жанры: песні зімовыя “за кудзеляй” гучаць у піліпаўку; у вяснова-летнім цыкле - “як полюць”, “сенакосныя”, “лугавыя”, “пастухоўскія”, “лесавыя”, “як грэчку ўбіраюць”, “як проса мнуць”, “ягадныя” (“як ходзяць у журавіны”). Характарыстыка напеваў умоўна прымеркаваных песень.

**Лекцыя16. Тэма1. Паставыя песні. Духоўныя вершы. Балады.**

***Тэрміналагічная база:*** Спецыфіка вытрымкі пастоў на Беларусі. Характарыстыка перыядаў зімовага (піліпаўскага), вясновага (вялікага) пастоў.

Патрабаванні да выканання паставых песень. Характэрныя асаблівасці паставых песень і іх тыпы: зімовыя (“піліпаўскія”, “мікольскія”, “ражстоўскія”, “за кудзеляй”, “на супрадках”), вясновыя (“запусныя”, “вялікапусныя”, “вялічкі”, балады, апавядальныя, пераказваючыя, бывалішныя песні, песні-прытчы, песенныя апавяданні героіка-эпічнага характару).

**Лекцыя16. Тэма2. Духоўныя вершы.**

***Тэрміналагічная база:*** Духоўныя вершы. Спецыфіка жанру. Характарыстыка вобразаў. Асаблівасці напеваў.

**Лекцыя16. Тэма3. Балады.**



Репозиторий ВГУ

***Тэрміналагічная база:*** Балады - складанасць жанру па паходжанню, стылю, тыповым адрозненням. Спецыфіка балад каляндарна-земляробчага цыклу і бытавых песень-балад. Тыпы балад каляндарна-земляробчага цыклу па функцыі песень: веснавыя, юраўскія, арэльныя, траецкія, купальскія, піліпаўскія, жніўныя. Старажытныя паэтычныя матывы каляндарных балад. Вобразы і водгукі жыццёвых калізій больш позняй эпохі ў баладных песнях. Характарыстыка напеваў каляндарных балад. Бытавыя балады і іх цесная сувязь з бяседнымі песнямі, песнямі, што спяваюць “абы-калі”, а ў больш познія часы з рэкруцкімі, салдацкімі, бурлацкімі, батрацкімі і інш. Балады калыскавыя і апавядальныя пра лёс замужніц. Сюжэты бытавых балад. Метамарфозы, пераўтварэнні, як найважнейшая рыса баладнага жанру. Характарыстыка напеваў бытавых балад.

**Лекцыя 17. Спецыфіка стылістыкі і тыпалогіі беларускіх народных напеваў старажытнага гістарычнага пласта (абагульненне).**

***Тэрміналагічная база:*** Рысы істотнай музычна-стылявой блізкасці, агульнасці старажытнага фальклорна-гістарычнага пласта. Перавага песенных напеваў манавобразнай структуры. Апора на інтанацыйныя комплексы - меладычныя “формулы”, “напевы-стрыжні” (афарыстычна сціснутыя - "формульныя" ці больш разгорнутыя, часткова лірызаваныя - тыповыя).

Спецыфіка аналізу напеваў.

Жанры традыцыйных беларускіх песень, схільных да міграцыйнасці і кансерватыўных да міграцыі. Жыццёвы змест, неаддзелены ад рэчаіснасці, эмацыянальна блізкі, глыбокі, канцэнтраваны ў формульных напевах. Сродкі ладамеладычнай, рытмічнай, тэмбрава-фактурнай і тэмбрава-дынамічнай выразнасці формульных напеваў. Вядучае значэнне моўнай асновы ў старажытных напевах. Разнавіднасці формульных напеваў паўімправізацыйных і рытмічна дакладных.

Спецыфіка “песеннага меладычнага тыпу” напеву ў адпаведнасці з комплексным метадам па сукупнасці прыкмет - рытмічная структура, меластрафа, ладамеладычная аснова, інтанацыйны комплекс.

Гістарычная абумоўленасць інтанацыйнага станаўлення народнай меладычнай сістэмы. Узаемадзеянне тыповых і нетыповых напеваў ва ўмовах строгай і ўмоўнай прымеркаванасці да часу і абставін выканання песенных жанраў.

**Лекцыя 18. Дзіцячы фальклор, як неад’емная частка беларускай традыцыйнай культуры.**

***Тэрміналагічная база:*** Старажытныя вытокі твораў дзіцячага фальклору. Спецыфіка жанру. Характарыстыка твораў, створаных дарослымі для дзяцей і самімі дзецьмі: калыханкі, забаўлянкі, дзіцячыя песенькі, заклічкі, лічылкі, дражнілкі, прыгаворы, дзіцячыя гульні, страшылкі, карагодныя песні, танцы, гульнёвыя карагоды ў дзіцячым фальклоры.

Тэндэнцыя пераходу ў дзіцячы фальклор твораў, якія страцілі сваё функцыянальнае прызначэнне ў побыце дарослых.

Методыка вывучэння асаблівасцяў дзіцячай культуры.

Фальклорная аснова дзіцячага музычнага інтанавання давербальнага і вербальнага перыядаў развіцця.

Сучасны дзіцячы фальклор.

Песенная і інструментальная дзіцячая творчасць без уплыву педагагічнага ўздзеяння ў сучаснасці.

Этнаграфія дзяцінства.

**Лекцыя 19. Познетрадыцыйная класіка народнай музыкі.**

***Тэрміналагічная база:*** Агульная характарыстыка II-га фальклорна-гістарычнага стылявога пласта. Час і гістарычныя ўмовы фарміравання.

**Лекцыя 19.Тэма 1. Казацка-сялянская сацыяльная лірыка.**

Репозиторий ВГУ

*Тэрміналагічная база:* Песні сялянскай вольніцы. Характарыстыка гістарычнага зместу новай эпохі канца XVI пачатку XVIII стагоддзяў і адлюстраванне яе ў паэтычных вобразах, сюжэтах песень. Асаблівасці мелодыкі, характарыстыкі напеваў.

Чумацкія, бурлацкія, рэкруцкія песні, як спецыфічныя беларускія жанры народнай музычнай творчасці.

**Лекцыя 19.Тэма 2. Гераічны кант.Фарміраванне кантавай традыцыі.**

*Тэрміналагічная база:* Гераічны кант на Беларусі. Беларускі кант, як істотна новы этап ў развіцці нацыянальнай музычнай культуры: народна-песеннай і прафесійнай. Стылістыка канта, паэтыка, вершаваная рытміка, рыфмоўка, ладамеладычны і музычна-рытмічны склад канта.

Уздзеянне кантавай культуры на фарміраванне песні савецкага перыяду.

**Лекцыя 19.Тэма 3. Пазаабрадавыя песні.**

*Тэрміналагічная база:* Пазаабрадавыя песні- спецыфічныя рысы.

Любоўна-лірычныя, жартоўныя, сямейна-бытавыя песні, прыпеўкі - спецыфіка жанраў, кола вобразаў, музычная стылістыка.

**Лекцыя 20. Рэвалюцыйная песенная класіка. Песні Змагання XIX - пачатку XX стагоддзяў.**

*Тэрміналагічная база:* Трэці фальклорна-гістарычны стылявы пласт: агульная характарыстыка.

Гарадская народна-бытавая песня - гістарычны шлях развіцця ў XVIII, XIX і пачатку XX стагоддзяў. Жорсткі раманс.

Батрацкія, адыходніцкія, рабочыя, рэвалюцыйныя песні. Песні на фалькларызаваныя паэтычныя тэксты паэтаў Расіі і Украіны ў актыве беларускага народнага рэпертуару. Народныя песні на вершы беларускіх паэтаў-прафесіяналаў. Шырыня жанравай сферы, багацце ўласна музычных праяў.

Гістарычныя песні на Беларусі: ідэі, вобразы, характарыстыка меласу, фактуры. Адсутнасць Дзекабрысцкіх песень на Беларусі. Жанр баявога гімну ў беларускай песеннай традыцыі. Жанр "гутаркі - песні". Песні сацыяльнага пратэсту.

Фарміраванне нацыянальнай традыцыі гімнатворчасці.

Рабочыя, лірычныя, жартоўна-гераічныя, сатырычныя песні ў гады рэвалюцыі 1905-1907г.г.

Інтэрнацыянальнасць і традыцыйнасць, як вызначальныя рысы фальклорнага стылю.

**Лекцыя 21. Народная песнятворчасць савецкага часу. Сучасны фальклор.**

*Тэрміналагічная база:* Аналіз гістарычнай эпохі. Перыяды няроўнай часавай працягласці: кастрычнік 1917г. і грамадзянская вайна да пачатку 20-х г.г.; 20-30-я гады; гады Вялікай Айчыннай вайны; пасляваенны час. Вызначальныя рысы кожнага перыяду.

Песні часоў грамадзянскай вайны. Народна-песенная творчасць 20-30г.г., развіццё самадзейнага мастацтва, калгасная песнятворчасць. Практыка стварэння самадзейных хароў і агульны фальклорны працэс 20-30 гадоў.

Народна-песенная творчасць Заходняй Беларусі (1921-1939г.г.)

Песнятворчасць перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941-1945г.г.). Партызанская песня, як з'ява беларускай народнай творчасці. Агітатрады і партызанскія атрады. Аўтары партызанскіх песень. Тыпізаваныя прыкметы жанру. Уплыў на фарміраванне жанру савецкай масавай песні калгаснай самадзейнасці даваеннага часу.

Сучасны стан традыцыйнай культуры. Праблемы захавання аўтэнтычнай традыцыйнай культуры ў сучасных умовах.

Рэпазіторый ВГУ

**Лекцыя 22.** **Жанры вусна-паэтычнага фальклору і іх сувязь з народнай музычнай творчасцю.**

***Тэрміналагічная база:*** Знітаванасць верша і музыкі ў песенных фальклорных жанрах. Узаемасувязь паэтычных і музычных вобразаў.

**Тэма 22.2.** **Замовы.**

***Тэрміналагічная база:*** Спецыфіка жанру. Замовы і светапогляд старажытных славян. Заклінанні, іх функцыі, адрозненне ад замоў. Праклёны, іх функцыі, адрозненне ад замоў і заклінанняў. Тыпы замоў у адпаведнасці з прызначэннем: гаспадарчыя ад розных хвароб, звязаныя з сямейным і прыватным жыццём, замовы грамадскага і сацыяльнага зместу. Кампазіцыя замоў, змястоўнасць кожнай часткі. Рытмічная, інтанацыйная арганізацыя замоў. Замоўны характар старажытных абрадавых песень.

**Тэма22.3.** **Казачны фальклор.**

***Тэрміналагічная база:*** Характарыстыка жанру, паходжанне назвы. Гістарычныя вытокі народнага казачнага эпасу. Цесная сувязь казак з міфамі, легендамі, паданнямі, замовамі, прыказкамі, прымаўкамі. Бытаванне казак на беларускай вёсцы ў часы наладжвання попрадак, са звычаяў расказваць фальклорныя творы ў пiлiпаўскі пост і калядныя вечары.

Вобразы казачнікаў у беларускім фальклоры. Казачнік Бай.

Класіфікацыя казак. Чарадзейныя, фантастычныя казкі, іх сувязь з міфамі, паданнямі, старажытнымі абрадамі. Казкі, сюжэты якіх сустракаюцца ў іншых славянскіх народаў. Казкі, звязаныя з беларускай гістарычнай рэчаіснасцю.

Казачныя вобразы Івана Прастачка, Івана Падвея (Удовінага сына), Івашкі Мядзвежага Вушка, Кацігарошка, Кірылы Кажамякі, Іллі Мурамца і іх сувязь з вобразамі старажытных былін, паданняў пра волатаў. Чарадзейныя казкі пра матэрыяльны дабрабыт. Характарыстыка зачынаў, канцовак, паўтораў, казачных формул чарадзейных казак.

Казкі пра жывёл, як найбольш старажытны від казачнага эпасу. Сувязь з паляўнічымі апавяданнямі старажытнасці, для якіх характэрны анімізм, татэмізм. Характэрныя рысы жанру. Цесная сувязь з музычным фальклорам. Тыповыя персанажы: ліса, воўк, мядзведзь, заяц, сабака, кот, баран, конь, певень, асэнсаванне іх вобразных рысаў і тыповых характараў і якасцей людзей праз гэтыя вобразы.

Адметныя рысы беларускіх народных казак пра жывёл.

Легендарныя казкі - казкі блізкія да легенд. Дзеючыя асобы легендарных казак. Казкі рэлігійнага і антырэлігійнага зместу.

Сацыяльна-бытавыя казкі і іх асаблівасці. Героі сацыяльна-бытавых казак і адносіны да іх у народзе.

Навелістычныя казкі і іх адметныя рысы ў параўнанні з сацыяльна-бытавымі. Героі навелістычных казак і іх станоўчыя, адмоўныя рысы. Тыповыя сюжэты.

**Тэма 22.3.** **Легенды і паданні**.

***Тэрміналагічная база:*** Спецыфічныя рысы жанра **легенды**. Час узнікнення, сутнасць назвы. Гістарычны шлях развіцця жанру легенд.

Касмаганічныя легенды: пра стварэнне Сусвету, Зямлі, Сонца, зорак, адрозненні легенд дахрысціянскага і хрысціянскага перыядаў.

Этыялагічныя легенды пра тлумачэнне жывёльнага свету.

Тапанімічныя легенды пра ўзнікненне пэўных гарадоў, вёсак, рэк, азёр, урочышчаў і іх назваў.

Этнаграфічныя легенды пра паходжанне народаў і плямёнаў.

Легенды аб дзеянні святых, вандраваннях Ісуса Хрыста.



Репозиторий ВГУ

Гістарычныя і гераічныя легенды.
Сацыяльна-бытавыя і ўтапічныя легенды.
Легенды часоў грамадзянскай вайны, Вялікай Айчыннай вайны.

Сувязь легенд з музычным фальклорам, іншымі відамі фальклору.

Вызначальныя рысы **паданняў**, іх адрозненне ад легенд і казак. Беларускія паданні часоў старажытнасці і іх героі. Паданні пра воінскія подзвігі герояў абаронцаў Русі ад захопнікаў. Беларускія гістарычныя паданні - пра войны, барацьбу з іншаземнымі захопнікамі, пра эпідэміі, пра гістарычных асоб і герояў; тапанімічныя - пра паходжанне гарадоў, мястэчак, вёсак, урочышчаў, гарадзішчаў.

Беларускія паданні пра гістарычнае мінулае ў старажытных хроніках XVI ст.

**Тэма 22.4. Загадкі, прыказкі, прымаўкі.**

***Тэрміналагічная база:*** Спецыфіка жанраў, іх старажытныя вытокі.

Сувязь зместу **загадак** з шматграннай рэчаіснасцю, асобай чалавека, яго працоўнай дзейнасцю, матэрыяльным, сацыяльным, духоўным жыццём, прыродай і яе з'явамі, жывёльным і раслінным светам. Метафарычныя і алегарычныя загадкі. Загадкі-пытанні, загадкі-задачы. Сувязь загадак з музычным фальклорам.

**Прыказкі**, як адлюстраванне жыццёвага вопыту і мудрасці народа. Тэматыка прыказак: пра жыццё і сямейны побыт чалавека, яго маральныя якасці, трапныя назіранні, разважанні, павучанні.

**Прымаўкі**. Вызначальныя рысы, іх адрозненне ад прыказак.

Значэнне прыказак і прымавак у абрадавым фальклоры.

## Лекцыя 23. Методыка этнафальклорных палявых даследванняў.

***Тэрміналагічная база:*** Збіранне, захаванне, даследванне і публікацыя фальклору - найважнейшыя задачы фальклярыстыкі. Мэты, задачы палявых даследванняў.

Этнафальклорныя экспедыцыі: мэта, задачы, спецыфіка арганізацыі. Віды фальклорных экспедыцый.

Падрыхтоўчы этап фальклорных экспедыцый: вызначэнне мэты, задач экспедыцыі, пісьмовая фіксацыя звестак аб фальклярыстычным вопыце ўдзельнікаў, вызначэнне маршруту экспедыцыі, пунктаў сацыяльнай дапамогі. Вывучэнне бібліяграфіі па гісторыі і культуры рэгіёну даследвання, фізіка-геаграфічнай, гісторыка-культурнай, этнафальклорнай спецыфікі рэгіёну.

Метадычная і тэхнічная падрыхтоўка. Асэнсаванне значнасці гутарковага майстэрства, камунікацыйнасці даследчыка. Авалоданне навыкамі карыстання тэхнічнымі сродкамі: аўдыа-, відэа-, фота. Вывучэнне методыкі запісу музычнага і паэтычнага тэксту з вуснай перадачы, удакладненне незразумелых слоў, фіксацыя зместу аудыа-, відэазапісаў. Методыка запісу святаў, абрадаў, харэаграфічнага фальклору, музычных інструментаў, касцюмаў, прадметаў быта, жанраў вуснай прозы. Работа з апытальнікамі.

Пашпартызацыя экспедыцыйнага матэрыялу: складанне пашпарту мясцовасці, выканаўцы - носьбіту традыцыі, вусных тэкстаў. Спецыфіка афармлення аўдыа-, відэакасет, абавязковая пашпартная інфармацыя напачатку запісу.

Уласна экспедыцыйная дзейнасць. Складанне справаздачы па выніках экспедыцыі з аналізам атрыманых вынікаў, колькасна-якасная, жанравая характарыстыка сабранага фальклорнага матэрыялу.

Спецыфіка апрацоўкі і архівізацыі экспедыцыйнага матэрыялу. Фальклорныя лабараторыі як архіўна-гістарычны і папулярызатарскі цэнтр рэгіянальнай традыцыйнай культуры.

Публікацыі аб выніках этнафальклорнай экспедыцыі.

## Лекцыя 24. Музычны фальклор у музычным выхаванні дзяцей і падлеткаў.

***Тэрміналагічная база:*** Значэнне фальклору ў выхаванні дзяцей і падлеткаў. Перыядызацыя дзіцячых узростаў. Дзіцячае музычнае інтанаванне давербальнага і вербальнага перыядаў развіцця. Фізіялагічныя і вакальныя асаблівасці дзіцячага голасу.

Рэпазіторый ВГУ

Музычны фальклор у сістэме дашкольнага, школьнага, пазашкольнага выхавання.
Методыка навучання дзяцей народным спевам.
Роля носьбітаў фальклорнай традыцыі ў навучанні дзяцей і моладзі.
Этнафальклорныя дзіцячыя калектывы як пераемнікі традыцыйнай культуры.

## ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ ВУСНАГА ТЫПУ ПА КУРСУ "НАРОДНАЯ МУЗЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ"

1. Народная музычная творчасць як грамадска-гістарычная і мастацкая з’ява.
2. Народная музычная творчасць - найважнейшая галіна нацыянальнай і сусветнай культуры.
3. Этнамузыкалогія і асновы фалькларыстычнай тэрміналогіі.
4. Дзяржаўная культурная палітыка ў галіне традыцыйнага мастацтва. Аналіз нарматыўных дакументаў, практыкі рэалізацыі дзяржаўных праграм па традыцыйнаму мастацтву.
5. Сінкрэтызм фальклору. Спецыфіка знітаванасці і ўзаемасувязі музычнага традыцыйнага мастацтва з іншымі відамі народнай творчасці.
6. Фальклор - творчасць працоўных, мастацкая дзейнасць непрафесіяналаў.
7. Асаблівасці твораў народнай музычнай творчасці ў параўнанні з прафесійнай музыкай.
8. Каляндарна-земляробчы цыкл абрадавых песень. Спецыфіка народнага каляндара.
9. Жанр. Абумоўленасць узнікнення фальклорных жанраў. Жанравая разнастайнасць фальклорных твораў. Спецыфіка фальклорна-гістарычных пластоў, час фарміравання.
10. Характарыстыка I фальклорна-гістарычнага пласта і яго жанраў.
11. Характарыстыка II фальклорна-гістарычнага пласта і яго жанраў.
12. Характарыстыка III фальклорна-гістарычнага пласта і яго жанраў.
13. Характарыстыка IV фальклорна-гістарычнага пласта і яго жанраў.
14. Этнаграфія. Музычная фалькларыстыка. Комплекс праблем, задачы.
15. Развіццё беларускай музычнай фалькларыстыкі. Беларускія музычныя фалькларысты.
16. Раннетрадыцыйная музычная класіка. Агульная характарыстыка абрадавых песень. Народная школа “галоснага спеву”.
17. Сувязі паміж народным і прафесійным музычным мастацтвам. Музычны фальклор як крыніца прафесійнай і аматарскай музычнай дзейнасці.
18. Веснавыя абрады і святы ў рэгіянальным і лакальным асвятленні.
19. Веснавыя загуканні. Веснавыя песні (агульная характарыстыка).
20. Валачобныя песні.
21. Юр’еўскія песні.
22. Траецкія (сёмушныя) песні, куставыя, русальныя песні.
23. Летнія абрады і святы.
24. Купальскія і пятроўскія песні.
25. Жніўныя песні.
26. Восеньскія абрады і святы.
27. Восеньскія песні.
28. Зімовыя абрады і святы ў рэгіянальным і лакальным асвятленні.
29. Зімовыя песні.
30. Масленіца. Масленічныя песні.
31. Талака, Талочныя песні.
32. Сямейна-абрадавыя песні. Агульная характарыстыка.
33. Радзіны: звычаі, абрады. Рэгіянальныя (лакальныя) асаблівасці.
34. Радзінныя песні.
35. Традыцыйнае вяселле - своеасаблівая народная опера. Этапы, звычаі.
36. Вясельныя песні. Вясельныя галашэнні.
37. Пахаванне, хаўтуры, галашэнні.
38. Беларускія народныя музычныя інструменты. Беларускія народныя музычныя выканаўцы.
39. Інструментальная народная музыка.

Репозиторий ВГУ

40. Песні з умоўным прымеркаваннем па часе і абставінах выканання (агульная характарыстыка).
41. Паставыя песні, духоўныя вершы.
42. Балады.
43. Спецыфіка стылістыкі і тыпалогіі беларускіх народных напеваў старажытнага гістарычнага пласта.
44. Дзіцячы музычны і гульнёвы фальклор. Этнаграфія дзяцінства.
45. Познетрадыцыйная класіка народнай музыкі. Пазаабрадавыя песні.
46. Казацка-сялянская сацыяльная лірыка: песні сялянскай вольніцы.
47. Чумацкія, бурлацкія песні. Гістарычныя песні. Рэкруцкія песні.
48. Гераічны кант.
49. Пазаабрадавыя песні: агульная характарыстыка. Жартоўныя песні. Сямейна-бытавыя песні. Любоўна-лірычныя пені. Прыпеўкі.
50. Рэвалюцыйная класіка. Песні змагання XIX пачатку XX ст. Батрацкія, адыходніцкія, рабочыя, рэвалюцыйныя песні.
51. Літаратурныя песні на словы прафесійных паэтаў.
52. Гарадская народна-бытавая песня. Жорсткія рамансы.
53. Песнятворчасць савецкага часу.
54. Музычная народная творчасць часоў грамадзянскай вайны.
55. Народна-песенная творчасць 20-30г.г.
56. Песенны фальклор Заходняй Беларусі (1921-1939г.г.)
57. Песенны фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Партызанскія песні (1941-1945г.г.)
58. Фальклор сучаснага перыяду.
59. Жанры вусна-паэтычнага фальклора і іх сувязь з народнай музычнай творчасцю (замовы, казкі, легенды, паданні, загадкі, прыказкі, прымаўкі, бывальшчына і інш.).
60. Методыка палявых даследванняў. Збіранне і захаванне музычнага фальклора.
61. Музычны фальклор у музычным выхаванні. Фальклорна-этнаграфічныя калектывы. Методыка пераймання аўтэнтычнай традыцыйнай культуры.
62. Спецыфіка аналіза народнай песні.

**Жанравы пералік фальклорных твораў з указаннем прыкладных узораў музычнай традыцыйнай класікі Беларусі**

1. Зімовы песенна-абрадавы цыкл: калядная абыходная гаспадару.
2. Зімовы песенна-абрадавы цыкл: калядная абыходная гаспадыні.
3. Зімовы песенна-абрадавы цыкл: калядная абыходная сыну.
4. Зімовы песенна-абрадавы цыкл: калядная абыходная дачцэ.
5. Зімовы песенна-абрадавы цыкл: калядная абыходная дзеду, старой, дзецям.
6. Агульнакалядныя песні.
7. Шчадроўскія песні.
8. Прыпеўкі да каляднай гульні “Жаніцьба Цярэшкі”.
9. Зімовыя карагоды і гульні.
10. Масленічныя песні.
11. Веснавы песенна-абрадавы цыкл: заклічкі да Бога.
12. Веснавы песенна-абрадавы цыкл: да птушак.
13. Веснавы песенна-абрадавы цыкл:да Прачыстай.
14. Веснавы песенна-абрадавы цыкл: да Вясны.
15. Валачобныя песні: гаспадарскія.
16. Валачобныя песні: песні каляндара земляроба.
17. Валачобныя песні: да дзяўчыны.
18. Валачобныя песні: да хлопца.
19. Валачобныя песні: песенныя канцоўкі.
20. Юраўскія песні.
21. Сёмушныя песні (траецкія).

Репозиторий ВГУ

22. Русальныя песні.
23. Куставыя песні.
24. Летні песенна-абрадавы цыкл: купальскія песні.
25. Летні песенна-абрадавы цыкл: жніўныя песні (зажынкі).
26. Летні песенна-абрадавы цыкл: жніўныя песні (уласна жніво).
27. Летні песенна-абрадавы цыкл: жніўныя песні (дажынкі).
28. Купальскія карагодныя песні.
29. Жніўныя карагодныя песні.
30. Восеньскія песні.
31. Піліпаўскія песні.
32. Талочныя песні.
33. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл.
34. Вясельныя: заручынныя песні.
35. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: песні суборнага вечара.
36. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: песні расплятання касы.
37. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: каравайныя песні.
38. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: пасадныя песні.
39. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: песні прыданак.
40. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: жартоўныя песні.
41. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: уласна вясельныя песні.
42. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: песні маладой-сіраце.
43. Сямейна-песенна-абрадавы цыкл: вясельныя галашэнні.
44. Радзінныя песні: бацьку.
45. Радзінныя песні: парадзісе.
46. Радзінныя песні: бабцы.
47. Радзінныя песні: кумам.
48. Бяседныя песні.
49. Галашэнні.
50. Духоўныя вершы.
51. Балады.
52. Познетрадыцыйная класіка: гістарычныя песні.
53. Познетрадыцыйная класіка: чумацкія песні.
54. Познетрадыцыйная класіка: рэкруцкія, салдацкія песні.
55. Познетрадыцыйная класіка: гераічны кант.
56. Рабочыя, рэвалюцыйныя песні.
57. Песні грамадзянскай вайны.
58. Песні перыяду 20-30 г.г.
59. Песні Заходняй Беларусі.
60. Жартоўныя пазаабрадавыя песні.
61. Сямейна-бытавыя пазаабрадавыя песні.
62. Прыпеўкі.
63. Любоўна-лірычныя песні.
64. Песні Вялікай Айчыннай вайны. Партызанскія песні.
65. Дзіцячыя музычныя гульні.
66. Дзіцячы фальклор. Калыханкі.
67. Дзіцячы фальклор. Дзіцячыя песенькі.
68. Абрадавыя творы, якія перайшлі ў дзіцячы фальклор.
69. Інструментальны фальклор: сігнальныя, гукавыяўленчыя найгрышы.
70. Інструментальны фальклор: песенныя найгрышы.
71. Інструментальны фальклор: маторныя найгрышы.
72. Танцавальная інструментальная традыцыйная музыка.
73. Маршавая інструментальная традыцыйная музыка.

Репозиторий ВГУ

74. Рускі музычны фальклор: Быліны.
75. Рускі музычны фальклор: Працяжная лірычная песня.
76. Рускі музычны фальклор: Гарадская песня XVIII - XIX ст.ст.
77. Лірычныя песні савецкага перыяду.
78. Песні сучаснага фальклору.

**П Л А Н**
**жанрава-стылістычнага аналіза народнай песні пісьмовай фіксацыі**

1. Назва песні па першаму радку.
2. Пашпартныя звесткі аб песні - месца, дата запісу, аўтар расшыфроўкі, спосаб запісу, жанр па вызначэнню выканаўцаў і па вызначэнню збіральніка.
3. Звесткі аб выканаўцах: прозвішча, імя, імя па бацьку. Год нараджэння. Месца нараджэння.
4. Запіс тэксту песні ў строгіх суадносінах з напевам.
5. Заўвагі, каментарыі да тэксту.
6. Аналіз фактуры - сольнае, ансамблевае (харавое) выкананне ў быце, якасць, складанасць партытуры.
7. Звесткі аб існуючых варыянтах з нотнымі і тэкставымі дадаткамі.
8. Аналіз паэтычнага тэкста.
9. Аналіз меладычнай страфы.
10. Аналіз рытмічнай страфы.
11. Мелодыка і лад.
12. Тактавая арганізацыя песні.
13. Асаблівасці жанра і замацаванне тэрміну паходжання песні. Наяўнасць сінкрэтызму пэўных этнафальклорных праяў у песні.
14. Спецыфіка выкарыстоўвання ў педагагічнай, культурна-асветніцкай практыцы. (Паводле Г. Рудневай.)

**ЛІТАРАТУРА**

*Беларуская* народная інструментальная музыка / Фоназапісы, натацыя, рэд. і сістэматызацыя найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Дз.Назінай. - Мн., 1989

*Беларускія* народныя абрады / Уклад., навук. рэд. і прадм. Л.П.Касцюкавец. - Мн., 1994

*Белорусская* этномузыкология: Очерки истории X1X-XX вв. / З.Можейко, Т.Якименко, Т.Варфоломеева и др.; Под ред. З.Можейко. - Мн., 1997

*Белорусские* народные найгрыши / Составитель И.Назина. - М., 1986

Валачобныя песні / Уклад. Г.А.Барташэвіч, Л.М.Салавей, В.І.Ялатава. - Мн., 1980

*Веснавыя* песні / Уклад. Г.А.Барташэвіч, Л.М.Салавей; Уклад. муз. часткі В.І.Ялатаў. - Мн., 1979

*Восточнославянский* фольклор: Словарь научной и народной терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) - Мн., 1993

*Вяселле:* Абрад / Уклад., уступ. арт. і кам. К.А.Цвіркі. - Мн., 1978

*Вяселле:* Мелодыі / Уклад. і сіст. напеваў З.Я.Мажэйка, Т.Б.Варфаламеевай. Рэд. напеваў З.Я.Мажэйка. - Мн., 1990

*Вяселле:* Песні. У 6 кн. - Мн., 1980-1988

*Жаніцьба* Цярэшкі / Уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л.М.Салавей; Уклад., сістэм. і расшыфроўка муз. матэрыялу, уступ. арт. і камент. І.Дз.Назінай. - Мн., 1992

*Жніўныя* песні / Уклад., уступ. арт., камент. А.С. Ліса, уступ. арт., сістэм. напеваў В.І.Ялатава. - Мн., 1974

*Зімовыя* песні: калядкі і шчадроўкі / Уклад. і сістэматызацыя тэкстаў, уступ. артыкул і камент. А.І.Гурскага; уклад., сістэматызацыя, характарыстыка і рэдагаванне напеваў З.Я.Мажэйкі. Рэд. М.Я.Грынблата. - Мн., 1975

Репозиторий ВГУ

*Купальскія* і пятроўскія песні / Уклад. А.С.Ліса, С.Т.Асташэвіч; уклад. муз. часткі Г.В.Таўлай; рэд. А.С.Фядосік. - Мн., 1985

*Мажэйка З.Я.* Песні Беларускага Паазер'я. - Мн., 1981

*Мухарынская Л.С., Якіменка Т.С.* Беларуская народная музычная творчасць: Вучэб. дапам. для муз. ВНУ. - Мн., 1993

*Назіна І.Дз.* Беларускія народныя музычныя інструменты. - Мн., 1997

*Пахаванні.* Памінкі. Галашэнні / Уклад. тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А.Васілевіча; Артыкул, сіст. і камент. напеваў Т.Б.Варфаламеевай. - Мн., 1986

*Попова Т.В.* Русское народное музыкальное творчество: Учеб. пособие для консерваторий и музыкальных училищ. Вып. 1. - М., 1955. Вып. 2. - М., 1956. Вып. 3. - М., 1957

*Радзіны:* Абрад. Песні / Уклад. і сістэм. тэкстаў Г.А.Пятроўскай; апісанне абрадаў Т.І.Кухаронак; уступ. арт. і камент. Г.А.Пятроўскай, Г.В.Таўлай, Т.І.Кухаронак. - Мн., 1998

*Сацыяльна*-бытавыя песні / Уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уступ. арт. і камент. І.К.Цішчанкі, В.І.Скідана; Уклад. муз. часткі Г.В.Таўлай; Рэд. А.С.Фядосік. - Мн., 1987

*Чурко Ю.М.* Белорусский хореографический фольклор. - Мн., 1990

*Шырма Р.* Беларускія народныя песні. У 4 т. - Мн., 1959-1976

*Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. - Мн., 1984-1987

*Этнаграфія* Беларусі: Энцыклапедыя. Рэдкал.: І.П.Шамякін (гл. рэд.) і інш. - Мн., 1989

Беларуская вусна-паэтычная творчасць: Падруч. для філал. спец. ВНУ. К.П.Кабашнікаў, А.С.Фядосік, А.С.Ліс і інш. - 2-е выд., перапрац. - Мн.: Вым. шк., 1988.

Гульні, забавы, ігрышчы. Мн.: Беларус. навука, 1996. 532 с.

Земляробчы каляндар: Абрады, звычаі. Мн.: Навука і тэхніка, 1990. 405с.

Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн.: Ураджай, 2000.

Мифы народов мира. Энциклопедия в двух томах. М.: Советская энциклопедия, 1991. Т.1., 1992. Т.2

Народны тэатр. Мн.: Навука і тэхніка, 1983.

Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. - Мн.: Выш. шк., 1997

Крук І.І. Следам за сонцам: Бел. нар. каляндар: Дапам. для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў - Мн.: Ураджай, 1998.

Т.І.Кухаронак Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў. Мн., Ураджай, 2001.

Замовы /Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А.Барташэвіч, Рэдкал.: А.С.Фядосік (гал. рэд.) і інш. - Мн.: Беларуская навука, 2000.

Легенды і паданні Віцебшчыны / Уклад. Н..Зайцавай. Вучэбна-метадычнае выданне. Віцебск: "Контур", 2002г.

## БІБЛІЯГРАФІЯ

**(Паводле Т.Я. Якіменка)**

### ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ, ДАВЕДНІКІ, СЛОЎНІКІ

1. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993.
2. Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мн., 1994.
3. Беларуская этнаграфія і фалькларыстыка: Бібліяграфічны паказальнік (1945–1970) / Склад. М. Я. Грынблат. Мн., 1972.
4. Восточнославянский фольклор: Словарь науч. и нар. Терми-нологии / Редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) и др. Мн., 1993.
5. Геаграфія Беларусі: Энцыкл. даведнік. Мн., 1993.
6. Мифы народов мира: Энциклопедия: В 2 т. / Гл. ред. С. А. То-карев. М., 1994.
7. Народы мира: Историко-этнограф. справочник. М., 1988.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1–2. Мн., 1993–1994.
9. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн., 1984–1987.
10. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.
11. Этнолингвистический словарь славянских древностей. Проект словника. Предварительные материалы. М., 1984.

### МАНАГРАФІІ. ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ.

Репозиторий ВГУ

## ЗБОРНІКІ ТЭЗІСАЎ, АРТЫКУЛАЎ, МАТЭРЫЯЛАЎ


1. *Азадовский М. К.* История русской фольклористики: В 2 т. М., 1958–1963.
2. Актуальные проблемы современной фольклористики: Сб. ст. и материалов / Сост. В. Е. Гусев. Л., 1980.
3. *Алексеев Э. Е.* Раннефольклорное интонирование: Звуковы-сотный аспект. М., 1986.
4. *Алексеев Э. Е.* Фольклор в контексте современной культуры: Рассуждения о судьбах народной песни. М., 1988.
5. *Аничков Е. В.* Весенняя обрядовая песня на Западе и у славян: В 2 ч. СПб., 1903–1905.
6. *Аничков Е. В.* Язычество и древняя Русь. СПб., 1914.
7. Ареальные исследования в языкознании и этнографии: Сб. ст. / Отв. ред. М. А. Бородина. Л., 1977.
8. Архаический ритуал в фольклорных и раннелитературных памятниках: Сб. ст. / Сост. Л. Ш. Рожанский. М., 1988.
9. *Асафьев Б.* Музыкальная форма как процесс / Ред., вступ. ст. и коммент. Е. М. Орловой. 2-е изд. Л., 1971.
10. *Асафьев Б.* О народной музыке / Сост. И. Земцовский, А. Кунанбаева. Л., 1987.
11. *Асафьев Б.* Речевая интонация. М.; Л., 1965.
12. *Афанасьев А. Н.* Поэтические воззрения славян на природу: Опыт сравнительного изучения славянских преданий и верований, в связи с мифическими сказаниями других родственных народов. Т. 1. М., 1865; Т. 3. М., 1869.
13. *Байбурин А. К.* Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов. СПб., 1993.
14. *Бандарчык В. К.* Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. Мн., 1972.
15. *Бандарчык В. К.* Гісторыя беларускай этнаграфіі: Пачатак XX стагоддзя. Мн., 1970.
16. *Бандарчык В. К.* Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ста-годдзя. Мн., 1964.
17. *Барташэвіч Г. А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985.
18. *Бахтин М. М.* Творчество Франсуа Рабле и народная куль-тура средневековья и Ренессанса. М., 1965; 2-е изд. М., 1990.
19. Беларусазнаўства: Навучальны дапаможнік / Пад рэд. П. Бры-гадзіна. Мн., 1997.
20. Беларусіка–Albaruthenica: У 3 кн. Мн., 1992–1994.
21. Беларускае народнае жыллё. Мн., 1973.
22. Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць: Гісторыка-тэарэтычнае даследаванне / Пад рэд. П. Ф. Глебкі, І. В. Гута-рава, М. Я. Грынблата. Мн., 1967.
23. Беларуская фальклярыстыка: Збіранне і даследаванне на-роднай творчасці ў 60-х гг. XIX – пачатку XX стагоддзя. Мн., 1989.
24. Беларускі музычны фальклор у даследаваннях маладых этнамузыколагаў: Зб. арт. / Склад. Т. С. Якіменка. Вып. 2. Мн., 1996.
25. Беларускія народныя абрады / Склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. Мн., 1994.
26. Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX – XX вв.) / З. Можейко, Т. Якименко, Т. Варфоломеева и др.; Под ред. З. Мо-жейко. Мн., 1997.
27. Белорусский музыкальный фольклор в исследованиях моло-дых этномузыковедов: Сб. ст. / Сост. Т. С. Якименко. (Вып. 1). Мн., 1991 (гл. 24).
28. *Беляев В.* Белорусская народная музыка. Л., 1941.
29. *Бессонов П.* Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, очерками народного обряда, обычая и всего быта. Ч. 1. Вып. 1. М., 1871.
30. *Благовещенский И. П.* К истории белорусской инструмен-тальной музыки // Некоторые вопросы музыкального искусства. Мн., 1965. С. 103–143.
31. *Богатырев П. Г.* Вопросы теории народного искусства. М., 1971.
32. *Богданович А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов: Этнограф. очерк. Гродно, 1895; Рэпрынтнае выд. Мн., 1995.
33. *Бромлей Ю. В.* Очерки теории этноса. М., 1983.
34. *Валодзіна Т. В.* Талака ў сістэме духоўнай культуры бела-русаў. Мн., 1977.
35. *Варфоломеева Т. Б.* Северобелорусская свадьба: Обряд, песенно-мелодические типы. Мн., 1988.
36. *Васілевіч У. А.* Збіральнікі. Мн., 1991.
37. *Велецкая Н. Н.* Языческая символика славянских архаиче-ских ритуалов. М., 1978.
38. *Веселовский А. Н.* Историческая поэтика / Под ред. В. М. Жир-мунского. Л., 1940; 2-е изд. / Вступ. ст. И. К. Горского. Сост., коммент. В. В. Мочаловой. М., 1989.
